

ЭТЫКЕТ ТРЭБА ВЫХОЎВАЦЬ З МАЛЕНСТВА

Сямейная газета

ГЛІНЯНЫЯ АБЯРЭГІ З КРЫЧАВА

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЛІПЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 128 (28995)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Мы казалі неаднаразова, што чакалі ў першым паўгоддзі таго факта, што ў гадавым вымярэнні інфляцыя будзе знаходзіцца вышэй за мэту, якая вызначана на год. Але якраз тыя фактары, якія падштурхоўвалі інфляцыю, слабеюць, мы бачым гэта ў апошнія месяцы. Таму лічым, што будзем знаходзіцца паблізу нашай мэты — 5 %».*

# ПАШТАР — СПРАВА МУЖЧЫНСКАЯ



Некалі ў вёсцы Касары Ушацкага раёна працавалі паштальёнамі мужчыны, і гэта была мясцовая славутасць. Цяпер у Касарах застаўся толькі адзін паштальён, і гэта таксама мужчына — Аляксандр АЛЕКСІЁНАК, работнік сувязі з дваццаціТрохгадовым стажам. Па-ранейшаму ў паштовай сумцы Аляксандра ляжаць розныя газеты і часопісы. А яшчэ Аляксандр Аляксандравіч прымае заказы ад старых вяскоўцаў на дастаўку ім прадуктаў харчавання і гаспадарчых тавараў. Ён дапамагае пенсіянерам плаціць і за камунальныя паслугі, і за электрычнасць, і за тэлефон. Яшчэ і пагаворыць шчыра, раскажа апошнія навіны (як на гэтым фота з цёзкай па прозвішчы Ірынай Паўлаўнай АЛЕКСІЁНАК). Адным словам, функцыя вясковага паштальёна яшчэ не вычарпана, і рана спісваць яе з жыццёвага рахунку.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• У Беларусі ў чэрвені зафіксавана дэфляцыя. Харчовыя тавары ў чэрвені патаннелі на 0,4 % у параўнанні з маем 2019-га і падаражэлі на 2,8 % у параўнанні са снежнем мінулага года.

• **Памёр народны мастак Беларусі Віктар Грамыка. Прэзідэнт Беларусі накіраваў спачуванні родным і блізкім мастака.**



• Мабільныя аператары ўвялі падвойнае пацвярджэнне платных падпісак.

• **«Еўраопт» аказаў Федэрацыі хакея Беларусі спонсарскую дапамогу ў памеры 130 тысяч долараў.**

• Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі падпісаў указ аб стварэнні зялёнага калідора для турыстаў у зоне ЧАЭС.

• **Экспазіцыя «Белпошты» ўдастоена залатога медаля на выстаўцы марак у Кітаі.**

• У Мінску па маршруце грамадскага транспарту запусцілі рэтрааўтобус.

ISSN 1990 - 763X

19128>

Прыёмная кампанія — 2019

# ВЫБРАЦЬ ПРАФЕСІЮ І НЕ ПАМЫЛІЦЦА

## 12 ліпеня распачынаецца прыём дакументаў у ВНУ

**Сёлета на бюджэтныя месцы змогуць прэтэндаваць 26,6 тысячы абітурыентаў — на 0,7 % больш, чым летась (дабаўлена каля 200 месцаў). Колькасць бюджэтнікаў дзённай формы навучання павялічыцца на медыцынскіх, ІТ-спецыяльнасцях, а таксама на спецыяльнасцях, звязаных з фізічнай культурай і спортам.**

**Платнікаў-першакурснікаў таксама стане больш — на 1,2 % у параўнанні з мінулым годам, усяго ВНУ прымуць 28,2 тысячы студэнтаў платнай формы навучання. Прырост адбыўся пераважна за кошт ІТ-спецыяльнасцяў (было дабаўлена больш за 650 месцаў).**

**У завочнай форме атрымання адукацыі плануецца скарачэнне прыёму на 3,4 %.**

### ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ ЧАКАЕ ДЗЯЎЧАТ

У шэрагу ўніверсітэтаў сёлета адкрываюцца новыя для іх спецыяльнасці. Напрыклад, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы ўпершыню на фізіка-тэхнічным факультэце аб'яўлены набор на спецыяльнасць «Камп'ютарная фізіка» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «Фізік. Праграміст». Важным адрозненнем новай спецыяльнасці з'яўляецца фундаментальная падрыхтоўка па агульнай і тэарэтычнай фізіцы, а таксама вывучэнне электронікі, мікрапрацэсарнай тэхнікі, аўтаматызацыі і робататэхнікі. Гэта адкрывае магчымасці для працаўладкавання не толькі ў ІТ-кампаніях, але і на сучасных высокатэхналагічных вытворчасцях.

Акрамя таго, сёлета ў ГрДУ імя Янкі Купалы адноўлены набор па спецыяльнасці «Гісторыя (археалогія)» на факультэце гісторыі, камунікацыі і турызму. А на факультэце эканомікі і кіравання аднаўляецца набор на завочнае скарочанае навучанне па спецыяльнасці «Камерцыйная дзейнасць».

СТАР. 4

Спажывец

# КАБ НЕ БАЛЕЛА ГАЛАВА ПАСЛЯ РАМОНТУ

## Як нашы кватэры становяцца таксічнымі

**«Дома і сцены дапамагаюць» — прымаўка вядомая. Але цяпер у нашых дамах нас акружае мноства таксічных прадметаў, якія могуць спакваля падточваць здароўе. Атрутныя рэчывы выдзяляюцца ў паветра мыйнымі сродкамі, бытавой тэхнікай, мэбляй, аздобнымі матэрыяламі... І гэтыя хімікаты немагчыма ліквідаваць з дапамогай вільготнай прыборкі. Многія гаспадыні блытаюць ідэальную чысціню ў доме з добрай экалогіяй, але гэта розныя паняцці. Калі вы пазбавіцеся ад пылу і бруду, паветра не абавязкова стане чысцейшае.**

**Больш падрабязна пра тое, з якімі небяспекамі можна сутыкнуцца ва ўласнай кватэры і што з гэтым рабіць, нам расказала загадчыца аддзялення камунальнай гігіены Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Юлія ЖУРАВА.**

СТАР. 13



# СЛУЖУ АЙЧЫНЕ!

## Прафесіяналізм вайскоўцаў — гарантыя мірнага і стваральнага жыцця Радзімы

**На людзей у пагонах ускладаецца адказнасць за спакой на беларускай зямлі ў эпоху глабальнай ваеннай нестабільнасці. Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас цырымоніі ўшанавання выпускнікоў вышэйшых ваенных навучальных устаноў Беларусі і Расіі і ўручэння генеральскіх пагонаў у Палацы Незалежнасці.**

Прэзідэнт адзначыў, што ў лёсах прысутных гэта дзень асаблівы, бо ўрачыстасць адбылася ў 75-ю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Прыгадваючы вялікі подзвіг героя, што адстаялі свабоду Айчыны, з пачуццём гордасці глядзім на ўсіх, хто, працягваючы слаўныя традыцыі, становіцца на абарону Радзімы; хто, прысягнуўшы краіне на вернасць, захоўвае мір і бяспеку краіны і дзейнасці людзей», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

«Міжнародная сістэма бяспекі пад пагрозай парушэння. Гэта выклікі, якія вы павінны аб'ектыўна ацэньваць і якім мусіце быць гатовыя процістаяць», — звярнуўся да ваеннаслужачых Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што прафесіяналізм людзей у форме, высокія маральныя якасці і імкненне самааддана абараняць сваю зямлю — гарантыя мірнага і стваральнага жыцця беларускай дзяржавы. І менавіта афіцэры Узброеных Сіл павінны ўдасканальваць іх, асвойваць найноўшыя ўзоры тэхнікі і ўзбраення, вучыць войскі дзеянням адпаведна з сучаснымі тэндэнцыямі ваеннай справы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што сур'ёзным іспытам на прафесійную сталасць будзе сумеснае аператыўнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Шчыт Саюза — 2019» (*пройдзе ў верасні на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. — «Зв.»*), і выказаў упэўненасць у гатоўнасці вайскоўцаў прадэманстраваць выдатную вывучку, мабільнасць і здольнасць хутка прымаць правільныя рашэнні.

Звяртаючыся да афіцэраў органаў унутраных спраў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Задачы, якія ставіць перад вамі дзяржава, нязменныя: абарона асобы, грамадства і краіны ад любых злачынных замахаў».

На супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях ускладаецца адказнасць за бяспеку жыцця і дзейнасці чалавека, прафілактыку і прадухіленне бытавых здарэнняў і тэхнагенных катастроф. У зоне асаблівай увагі — эксплуатацыя Беларускай атамнай электрастанцыі.

Ад выпускнікоў-пагранічнікаў з улікам узрастання негатыўных фактараў, звязаных з незаконнай міграцыяй, наркатрафікам, кантрабандай, чакаюць падтрымання высокага ўзроўню баявой гатоўнасці, умення адэкватна рэагаваць на развіццё абстаноўкі ў пагранічнай сферы.

Супрацоўнікам спецслужбаў Прэзідэнт наказаў засяродзіць намаганні на нейтралізацыі праяў тэрарызму і экстрэмізму, распальвання нацыянальнай і рэлігійнай варожасці ў грамадстве, прымаць меры па недапушчэнні нанясення эканамічнага ўрону дзяржаве.

«Заўсёды памятайце, што афіцэр славуты не пагонамі, а гонарам», — даў настаўленне выпускнікам Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што беларускі народ вельмі цэніць і паважае ўсіх, хто па клічу сэрца выбірае прафесію служыць сваёй краіне, і ведае, што знаходзіцца пад надзейнай абаронай.

«Будзьце вартыя гэтага даверу. Жадаю вам поспехаў і — самае галоўнае, важнае для афіцэра — надзейнага тылу», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

Са свайго боку, людзі ў форме выказалі гатоўнасць заўсёды процістаяць любым пагрозам нацыянальнай бяспецы і паабяцалі зрабіць усё, што ад іх залежыць і нават больш, каб захаваць мір, спакой на беларускай зямлі.

«Апраўдаем аказаны нам высокі давер, пацвердзіўшы гэта сваёй ратнай працай, рэалізуем на практыцы атрыманыя веды з мэтай забеспячэння нацыянальнай бяспекі», — ад імя таварышаў запэўніў Прэзідэнта выпускнік факультэта Генеральнага штаба Валерый Булыга.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# ВЫСЛУХАЦЬ І ПАДТРЫМАЦЬ

**Учора прыём грамадзян у Мінску правяла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА. На прыём запісалася больш за 20 чалавек. Аднак ахвотных асабіста сустрэцца з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта, каб расказаць пра свае праблемы і знайсці падтрымку, аказалася значна больш. Людзі выказваліся пра сітуацыю ў бізнес-асяроддзі, уздымалі праблемы ў сферах медыцыны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва.**

Жыхарка вёскі Мікалаеўка-2 Ірына Цімошчанка папрасіла кіраўніка Адміністрацыі прыняць удзел у лёсе сваіх 11-гадовых трайнят. Юныя музыканты неаднаразова станавіліся лаўрэатамі міжнародных конкурсаў і былі прадстаўлены на суісканне стыпендыі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Сёлета яны паспрабавалі паступіць у гімназію-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Па словах мамы, дзеці годна вытрымалі экзамены па спецыяльнасці, акрамя сальфеджыа, якое не выкладаецца на такім высокім узроўні ў звычайнай музычнай школе, што і падвяло дзяцей. Ірына Цімошчанка звярталася па дапамогу ў Міністэрства адукацыі з просьбай выдзеліць у якасці выключэння дадатковыя месцы для яе дзяцей, аднак у ведамстве спасаліся на правілы прыёму, вялікі конкурс і адказалі адмовай. Тады шукаць падтрымкі жанчына стала ў Адміністрацыі Прэзідэнта, бо перакананая, што дзяржава павінна прыкладаць максімум намаганняў для падтрымкі таленавітай моладзі.

Наталля Качанава запэўніла, што ў гэтым пытанні будзе даручана дэталёва разабрацца міністрам адукацыі і культуры. Калі не атрымаецца выдзеліць дадатковыя месцы ў гэтай гімназіі-каледжы, будуць разгледжаны іншыя падобныя навучальныя ўстановы ў Мінску і вывучана магчымасць прадастаўлення дзецям інтэрнатаў. Наталля Качанава таксама звярнула ўвагу на неабходнасць падтрымкі шматдзетных сем'яў, але разам з тым папярэдзіла, што пытанне з паступленнем трайнят не павінна вырашацца на шкоду інтарэсам іншых таленавітых дзяцей. «Мы гэтае пытанне з усіх бакоў вывучым. Калі будзе магчымасць узяць дзяцей дадаткова — гэта адна сітуацыя. Калі будзе стаяць пытанне аб тым, што трэба будзе камусьці саступіць, гэта будзе несумленна», — патлумачыла яна.

На сустрэчу прыйшлі таксама маці, чые сыны былі асуджаныя па артыкуле 328 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Запісаліся на прыём да Наталлі Качанавай і прадстаўнікі цыганскай дыяспары з Магілёва. Сярод іншага іх цікавілі пытанні працаўладкавання, магчымая падтрымка пры вядзенні фермерскай гаспадаркі. Адпаведныя меры ўжо прымаюцца на ўзроўні Магілёўскага аблвыканкама. Акрамя таго, прадстаўнікі дыяспары падзякавалі кіраўніку Адміністрацыі за нядаўнюю сустрэчу ў Магілёве і выказалі ўдзячнасць Прэзідэнту за тое, што не застаўся абыякавы да іх праблем.

**Паводле БелТА.**

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» ПРОЙДЗЕ СПАКОЙНА

Бяспека на масавых мерапрыемствах кшталту адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску» і канцэртаў міжнароднага фестывалю мастацтваў будзе забяспечаная акуратна і надзейна. У гэтым журналістаў пасля ўрачыстасці ў Палацы Незалежнасці запэўніў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ**. Па яго інфармацыі, правядзенне мерапрыемстваў забяспечаць віцебскія міліцыянеры і прыцягнутыя сілы з абласцей і Мінска.

Для праваахоўцаў год аказаўся складаны: мінулі маштабныя дзяржаўныя святы, ІІ Еўрапейскія гульні, Купалле. Як прызнаў Юрый Караеў, стомленасць адчуваецца, але перанапружанасці не было — дзякуючы правільнаму планаванню задоўга да мерапрыемстваў.

«Нагрузка на супрацоўнікаў не была павышаная бяздумна — былі размеркаваныя сілы і сродкі, каб сканцэнтраваць дастатковую колькасць ваеннаслужачых для забеспячэння ў першую чаргу змяняльнасці адпачынку, добрых бытавых умоў», — растлумачыў міністр. Ён адзначыў, што з уступлення на пасаду наведваў не толькі месцы нясення службы на аб'ектах ІІ Еўрапейскіх гульняў, але і месцы адпачынку супрацоўнікаў, бо ад якасці вольнага часу непасрэдна залежаць вынікі службы.

«Мы працуем для грамадства і не проста выконваем задачы дзеля абстрактнага «закону», а глядзім, як гэта адлюстроўваецца. Як сказаў кіраўнік дзяржавы: працуем для абароны асобы, грамадства, дзяржавы. Мы гэта паняцці атаясамліваем», — падкрэсліў Юрый Караеў, заўважыўшы пры гэтым, што для міністэрства важная зваротная сувязь з насельніцтвам.

Па словах міністра, органам унутраных спраў не ўсё роўна, што кажуць як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі.

«Прыслухоўвацца да меркавання апанентаў, у якім таксама можа быць — і вельмі часта — рацыянальнае зерне. Прыклад: калі я сказаў, што мы будзем адкрытыя гасцям ІІ Еўрапейскіх гульняў, у каментарыях не раз праскочыла: «А да сваіх грамадзян ты будзеш адкрыты?». Канешне, я агаварыўся: да ўсіх людзей — і гасцей, і сваіх грамадзян. Свае грамадзяне — перш за ўсё», — прызнаў міністр унутраных спраў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі адмяніў правядзенне парада ў Дзень незалежнасці па фінансавых меркаваннях

Украінскі прэзідэнт Уладзімір Зяленскі адмяніў правядзенне традыцыйнага ваеннага парада ў Дзень незалежнасці 24 жніўня з прычыны дарагавізны. У відэазвароце на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» ён паведаміў, што замест гэтага «300 мільёнаў грыўняў будзе выдзелена на прэміі ваенным».

«Хачу падзяліцца з вамі нашай новай ідэяй. Звычайна 24 жніўня на Дзень незалежнасці Украіны ў нас праходзіць ваенны парад — такі пампезны і нятанны. Мне здаецца, сёлета замест парада лепш гэтыя грошы выдзеліць нашым героям, нашым ваенным, і мы прынялі рашэнне выдзеліць 300 мільёнаў грыўняў (звыш 11,7 мільёна долараў) на прэміі ўсім нашым ваенным — гэта салдаты тэрміновай службы, гэта курсанты, сяржанты, афіцэры, гэта ўсе ваеннаабавязаныя, якія выконваюць заданні ў зоне правядзення аперацыі аб'яднаных сіл», — сказаў ён.

Пры гэтым Зяленскі адзначыў, што 24 жніўня гэтага года Кіеў будзе «ўшаноўваць герояў» і святкаваць Дзень незалежнасці, перадае ТАСС. «Але будзе новы фармат», — падкрэсліў прэзідэнт.

Мяркуючы па каментарыях да публікацыі, украінцы ўспрынялі прэзідэнцкую ініцыятыву з адабрэннем. «Нарэшце разумны падыход да вайсковага парада падчас вайны! Гэта найлепшае рашэнне!» — напісаў адзін з інтэрнэт-карыстальнікаў.

### У цэнтры Смаленска знайшлі магілу генерала Гюдэна

У самым цэнтры Смаленска, на Каралеўскім бастыёне ў Цэнтральным парку культуры і адпачынку «Лапацінскі сад», разбітым на месцы былой ваеннай крэпасці, археолагі зрабілі сенсацыйную знаходку — знойдзена магіла блізкага сябра, любімца французскага імператара Напалеона І, дывізіённага генерала Гюдэна.



Магілу палкаводца шукалі шмат гадоў. Было вядома толькі прыблізнае месца пахавання. Спачатку археолагі абследавалі Шэйнаў бастыён у гістарычным цэнтры Смаленска. Тая «археалагічная выведка» праходзіла з 6 па 28 мая. Але на Шэйнавым бастыёне парэшткаў не знайшлі. А з 25 чэрвеня пачаліся пошукі на Каралеўскім бастыёне, якія, відавочна, мелі плён.

Цікава, што ў савецкі час над магілай Гюдэна ўзвялі грунтоўную танцпляцоўку. Каб дабрацца да пахавання, археолагам давялося разабраць яе цагляны падмурак. Многія пакаленні жыхароў Смаленска, самі таго не ведаючы, танцавалі на касцях французскага генерала.

За 207 гадоў з моманту пахавання вечка труны правалілася, унутр трапілі зямля і вада, таму археолагі ўбачылі парэшткі генерала ў вельмі дрэнным стане. Акрамя таго, «апазнаць» Гюдэна навукоўцы змаглі па адсутнасці левай нагі і раздробненай правай — у бітве каля вёскі Лубін, у якой французы страцілі 8,5 тысячы чалавек, генерал атрымаў смяротнае раненне: пры адным з першых стрэлаў рускіх гармат яму адарвала ядром левую нагу і пакалечыла правую.

Па загадзе імператара Напалеона сэрца генерала Гюдэна было перавезена ў Францыю і пахавана на могілках Пер-Лашэз, у грабніцы пяхотнай дывізіі, якой камандаваў Гюдэн. Імя генерала Гюдэна занесена ў спіс найбольш шанаваных у Францыі генералаў на ўсходнім баку Трыумфальнай аркі.

### Дыетолагі: не варта ў дзень з'ядаць больш за 150 грамаў грыбоў

Калі прытрымлівацца гэтай нормы, арганізм атрымае аптымальную колькасць карысных рэчываў, якія змяшчаюцца ў грыбах, перадае РІА «Навіны». Гэтыя рэчывы становяцца адбіваюцца на сардэчна-сасудзістай і нервовай сістэмах, маюць супрацьракавы эфект.

Каментуе ўрач-дыетолаг, кандыдат медыцынскіх навук АленаЛіванцова: «Грыбы з'яўляюцца крыніцай бялку, вітамінаў груп В і С, нікацінавай і фоліевай кіслот, кальцыю, фосфару, калію і жалеза. Усе гэтыя элементы становяцца ўплываюць на работу сардэчна-сасудзістай і цэнтральнай нервовай сістэм, умацоўваюць касцявую тканку, аказваюць антыаксідантны ўплыў на арганізм, а таксама дабратворна ўздзейнічаюць на кровавтварэнне.

Грыбы могуць прынесці карысць людзям з цукровым дыябетам. Грыбы валодаюць і проціпухлінным эфектам, які звязаны з наяўнасцю селену і вітаміну С. Проціпухлінная актыўнасць звязана яшчэ і з бялкамі-лектынамі, якія цяпер актыўна даследуюцца ў анкалогіі. Яны з'яўляюцца пасткамі для пухлінных клетак».

Але шмат што залежыць ад месца вырастання грыба. Участкі, прылеглыя да трас, — дрэннае месца для збору грыбоў. Грыбы не рэкамендаваны асобам з хваробамі стрававальна-кішачнага тракту ў час абвастрэння, з ныркавай і пячоначнай недастатковасцю. Не варта ўжываць грыбы сырымі — дыетолагі раяць іх абсмажваць без алею непрацяглы час.

Сезон адпачынку

# ЛЕТА Ў РАЗГАРЫ

## Як праходзіць аздараўленчая кампанія?

**Больш за 300 тысяч дзяцей ужо прайшлі аздараўленне ў летніх лагерах, дзе падыходзіць да завяршэння другая змена. Працягваецца аздараўленчая кампанія і ў санаторыях краіны: яны цалкам запоўнены, і такая тэндэнцыя захаваецца як мінімум да канца лета. Пра асаблівасці сёлетняга летняга адпачынку расказаў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**



zubronok.by

### У прыярытэце — бяспека дзяцей

— Мы планавалі аздаравіць гэтым летам 390 тысяч дзяцей. І за першую і другую змены справіліся з гэтай задачай на 80 працэнтаў: больш за 300 тысяч дзяцей ужо адпачылі ў лагерах, — падкрэсліў спецыяліст.

У краіне працуе больш за 5 тысяч лагераў. Усе стацыянарныя ўстановы былі адкрыты згодна з планам. На аднаўленне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы сёлета было выдаткавана каля 12 мільёнаў рублёў з розных крыніц, у тым ліку сродкі рэспубліканскага суботніка. Сярэдні кошт пуцёўкі ў лагер з кругласутачным знаходжаннем склаў 450 рублёў, з дзённым знаходжаннем — 120 рублёў. Нагадаем, што бацькі аплачвалі ўсяго 10 % ад гэтай сумы, істотную яе частку склала дзяржаўная датацыя (196 рублёў у кругласутачным лагеры), а розніца кампенсавалася прафсаюзнымі арганізацыямі і мясцовымі бюджэтамі.

— Прыярытэтам аздараўленчай кампаніі з'яўляецца бяспека дзяцей, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі. — Сумесна з прадстаўнікамі міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя мы праводзілі маніторынг, і па выніках першай і другой змен нештатных сітуацый і надзвычайных здарэнняў не было.

З кожным годам у дзіцячых санаторыях і рэабілітацыйных цэнтрах павялічваецца колькасць замежных гасцей. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца нашы ўстановы ў арганізаваных спартыўных груп.

— Нашы дзіцячыя санаторыі і рэабілітацыйныя цэнтры валодаюць выдатнай спартыўнай базай. У прыватнасці, заламі з высокай столлю, што дазваляе трэніравацца групам па спецыялізаваных відах спорту — мастацкай гімнастыцы, альпінізме. Па выніках года колькасць замежных дзяцей, якія адпачылі ў нас, будзе большая, чым летась, — упэўнены Генадзь Балбатоўскі.

Па праграме Саюзнай дзяржавы для аздараўлення беларускіх дзяцей закуплена 210 пуцёвак у рэабілітацыйныя цэнтры «Світанак», «Жамчужына» (Беларусь) і «Янтар» (Расія).

### Самыя папулярныя — санаторыі найвышэйшай катэгорыі

Санаторна-курортныя арганізацыі краіны запоўнены цалкам, і такая сітуацыя захаваецца да канца лета. У першым паўгоддзі за сродкі бюджэту ў іх прайшло аздараўленне больш за 400 тысяч чалавек. На гэта з бюджэту выдаткавана каля 305 мільёнаў рублёў. Павялічылася (на 12 %) і колькасць пуцёвак, якія рэалізавалі самі санаторыі, выручка склала 195 мільёнаў рублёў.

**Адзін дзень у стандартным двухмесным нумары каштуе каля 55 рублёў.**

Беларускія санаторыі паранейшаму карыстаюцца папулярнасцю ў суседзяў — з пачатку года да нас прыехала больш за 110 тысяч замежных грамадзян. Прычым калі раней доля расіян у ліку замежнікаў складала 90 %, то цяпер за кошт гасцей з краін Прыбалтыкі, Польшчы і Германіі колькасць адпачывальнікаў з усходняй краіны-суседкі зменшылася да 85 %.

Самымі запатрабаванымі нязменна застаюцца санаторыі найвышэйшай катэгорыі, якія валодаюць моцнай матэрыяльна-тэхнічнай базай. У топе па запаўняльнасці — «Юнацтва», «Ружанскі», «Радон», «Прыазёрны», «Сосны».

— Санаторый «Юнацтва» яшчэ ў студзені 2019 года прадаў усе пуцёўкі на святкаванне Новага года ў 2020-м. І дырэктар атрымліваў скаргі, што абмяжоўвае доступ, а на самай справе ўсё выкуплена, — тлумачыць Генадзь Балбатоўскі.

Кошт пуцёвак у санаторыі на працягу года застаецца нязменным. У параўнанні з мінулым годам ён павялічыўся не больш чым на 6 %. Адзін дзень у стандартным двухмесным нумары каштуе каля 55 рублёў. Што датычыцца пуцёвак у свабоднай рэалізацыі, то тут цэны ўстанаўлівае сам уласнік у залежнасці ад сезона і попыту.

**Алена КРАВЕЦ.**

Базарны дзень

# НА ЎСЕ ГАЛАСЫ

Напярэдадні адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску» ўдзельнікаў Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні чакаў прыемны сюрпрыз — паездка ў Мінск і экскурсія ў Палац Незалежнасці, дзеючую рабочую рэзідэнцыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якая адчыняецца для наведвальнікаў толькі ў загадзя вызначаны тэрмін і ў адмысловых выпадках. Маладыя артысты з 18 краін свету ў адзін голас зазначалі, што ім вельмі прыемна адчуваць сябе пачэснымі гасцямі.

Юнакі і дзяўчаты з захапленнем слухалі аповед пра гісторыю будаўніцтва і аздаблення Палаца і плошчы Дзяржаўнага Сцяга, прымяраліся да крэслаў, дзе засядалі ўдзельнікі «нармандскай чацвёркі», замілоўваліся прыгажосцю зімовага саду і ўражваліся экспанатамі з музея падарункаў, рабілі мноства сэлфі. А яшчэ спявалі. Руская, казахская, англійская, грузінская, кітайская — песні на гэтых і іншых мовах гучалі ў залах і калідорах Палаца Незалежнасці ўперамежку са словамі захаплення і любові да Беларусі.

Прадстаўнік нашай краіны Ваня Зданюк, які зусім нядаўна, не выпадаючы з працоўнага рытму, адзначыў 20-годдзе, прызнаўся, што таксама трапіў на экскурсію ў Палац упершыню: «Што я адчуваю? Вялікую радасць і гонар, калі ўсе замежныя ўдзельнікі з блізкіх і далёкіх краін гавораць, як у нас прыгожа, захапляюцца майстэрствам беларускіх вытворцаў, якія абсталёўвалі і аздаблялі Палац Незалежнасці. Адчування канкурэнцыі паміж намі зусім няма, усе вясёлыя і лёгкія ў стасунках, у нас шмат агульных тэм для размоў. І хоць, безумоўна, прысутнічае хваляванне перад конкурсам, для мяне самае важнае — не проста выступіць як мага лепш і пайсці, а запомніцца слухачам, знайсці тых людзей, якія будуць ісці побач цягам усяго творчага шляху».

Прадстаўнік са Швейцарыі (гэтая краіна ўпершыню ўдзельнічае ў конкурсе «Славянскага базару»), які выступае пад творчым псеўданімам ТН30, расказаў, што раней бачыў толькі адну рэзідэнцыю найвышэйшых дзяржаўных асоб — Букінгемскі палац. «Але я бачыў яго толькі звонку, а тут атрымаў унікальную магчымасць паглядзець знутры на месца, дзе сустракаюцца многія ўплывовыя палітыкі свету. Шмат белага колеру — гэта добра, дае адчуванне чысціні, прасторы і настройвае на пазітыўны лад», — зазначыў артыст.

«Мяне вельмі ўразілі маштаб і неверагодная прыгажосць Палаца. Асаблівую цеплыню выклікалі фотаздымкі з асабістага архіва вашага Прэзідэнта. А калі ўбачыла сярод афіцыйных фатаграфій здымак з Сі Цзіньпінам, адчула сябе як дома», — жартуе прадстаўніца Кітая Сыин Лі. Дарэчы, у роднай краіне яна глыбока вывучае кітайскую народную песню: Сын Лі, даследчык тэорыі, выкладчык мастацка-выканаўчага факультэта Чунцынскага прафесійнага каледжа культуры і мастацтва, а таму на сцэне Летняга амфітэатра ў Віцебску пастараецца перадаць частку культуры і традыцый гэтай вялікай краіны.

Лаўрэат леташняга конкурсу маладых выканаўцаў «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» Іван Дзятлаў з Расіі рассыпаецца ў кампліментах: «Калі я пачуў, як хутка быў узведзены Палац Незалежнасці, адразу не паверыў, настолькі карпатлівая і якасна ўсё тут зроблена. Тут усё ўражвае, з аднаго боку, велічнасцю, а з другога, утульнасцю, асаблівай гасціннасцю». На просьбу выканаць урывак з песні, якая атаясамліваецца ў яго з Беларуссю, хлопец не задумваючыся спявае «Белавежскую пушчу».

Некалькі гадоў таму, у 2015-м, прадстаўнік Казахстана Дзімаш Кудайберген феерычна выйграў конкурс «Славянскага базару» і з таго часу заявіў пра сябе ці не на ўвесь свет. А сёлета яго зямляк, спявак Адзільхан Макін, кажа, што не адчувае цяжару адказнасці за пастаўленую творчую планку: «Мы з Дзімашам даўно і добра сябруем. І я, як наогул усе ў Казахстане, шчыра радуюся, калі пра майго сябра, майго брата гавораць у іншых краінах. Што да мяне, то ўсе хваляванні я пакіну на рэпетыцыях і за кулісамі, а на сцэне адчуваю сам і паспрабую перадаць слухачам сапраўдны драйв».

«Мы тут усе не сапернікі, мы сябры, — дадае Георгій Путкарадзэ з Грузіі, — таму ўсё, што я магу пажадаць сабе і іншым, — няхай усё будзе добра!»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК




Фота БелТА.

**Сёння, 11 ліпеня — цырымонія адкрыцця міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Па добрай традыцыі ў Летнім амфітэатры прагучаць пазыўныя фэсту, і вядучыя зноў скажуць на розных мовах: «Гаворыць і паказвае Віцебск!». І на працягу пяці дзён афіцыйнай часткі форуму з раніцы да ночы ў горадзе будуць правіць баль музыка, танцы, тэатральнае і іншыя віды мастацтва.**

Як і ў мінулыя гады, горад над Заходняй Дзвіной становіцца месцам, дзе збіраюцца не толькі артысты, але і палітыкі. Традыцыйна шмат прадстаўнікоў Расіі. У прыватнасці, віцэ-прэм'ер расійскага ўрада Вольга Галадзец планує наведаць Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. І. Салярцінскага.

Насычаная будзе праграма знаходжання на фестывалі дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты, які збіраецца наведаць мультымадальны прамыслова-лагістычны комплекс «Брэміна-Орша» ў Аршанскім раёне, а 12 ліпеня стане гледачом гала-канцэрта, прысвечанага 50-годдзю Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» і 20-годдзю цеснага супрацоўніцтва дзвюх краін. Па традыцыі з саюзнага бюджэту фінансуюцца ў рамках фестывалю многія канцэртныя праекты, выстаўкі, прэзентацыі і іншае. Сёлета, напрыклад, у Мастацкім музеі на выстаўцы аднаго дня 12 ліпеня прадставяць шэдэўр ювелірнага мастацтва — рэпліку вялікай імператарскай кароны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Сугучча

# АЗЕРБАЙДЖАНСКІ ПІСЬМЕННІК — ГОСЦЬ БЕЛАРУСІ

**Празаіка, публіцыста, перакладчыка Камрана Назірлі, які жыве і працуе ў Азербайджане, добра ведаюць і ў Беларусі.**

Па-першае, ён — актыўны прапагандыст беларускай літаратуры ў Баку. Дзякуючы яго перакладчыцкім намаганням у Азербайджане пабачыў свет цэлы шэраг кніг беларускіх аўтараў: раман Мікалая Чаргінца «Сыны», кніга апавяданняў Анатоля Матвіенкі, творы іншых празаікаў Беларусі. Камрана Назірлі ў знак прызнання яго заслуг прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Па-другое, азербайджанскі творца не першы раз госцюе ў Беларусі. Яму даспадобы краявіды Гродзеншчыны, Міншчыны, беларускія азёры і рэкі. Вось і сёлета спадар Назірлі адпачываў у Беларусі. Але і працаваў, сустракаўся з беларускімі літаратарамі. У Парэччы, на Гродзеншчыне, наладзіў імпрэзу ў знак памяці класіка азербайджанскай літаратуры Нізамі. І гэта зусім не выпадковы выбар: гэты год абвешчаны ў Азербайджане Годам Нізамі. На сустрэчу ў знак памяці класіка прыйшлі і беларускія літаратары — старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Людміла Кебіч, паэты Дзмітрый Радзівончык, Браніслаў Ермашкевіч і шмат хто яшчэ. Гучалі беларуская, руская і азербайджанская мовы. Размова ішла пра месца мастацкага слова ў выхаванні грамадства, пра ролю літаратуры ў культуры, гуманітарнае развіццё народаў і краін.

Сустрэча з азербайджанскім пісьменнікам нагадала, што некалі імпрэзы, творчыя вечарыны пісьменнікаў — гасцей з розных куточкаў свету — былі добрай традыцыяй і ў Мінску, і ў Гродна, і ў іншых гарадах і нават вёсках Беларусі. Такія святы слова пашыраюць межы нашых уяўленняў пра ўвесь свет.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# ВЫБРАЦЬ ПРАФЕСІЮ І НЕ ПАМЫЛІЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Полацкім дзяржаўным ўніверсітэце чакаюць моладзь на спецыяльнасцях «Камп'ютарная бяспека» (матэматычныя метады і праграмныя сістэмы), «Аўтамабільныя дарогі» і «Электронны маркетынг».

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны адкрывае набор на спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» са спецыялізацыяй «антыкрызіснае кіраванне прадпрыемствам», «Эканамічная інфарматыка», «Спартыўна-педагагічная дзейнасць» (трэнерская работа).

У Беларуска-Расійскім універсітэце абвешчаны набор на спецыяльнасці «Электронны маркетынг», «Абсталяванне і тэхналогіі высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі металаў», «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у праектаванні вытворчасці)».

Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт набірае абітурыентаў на спецыяльнасць «Дызайн (віртуальнага асяроддзя)».

**У апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне!**

У БДУ адбудзецца першы набор (у тым ліку на бюджэтную форму навучання) у Сумесны беларуска-кітайскі інстытут, створаны Белдзяржуніверсітэтам і Далянскім політэхнічным універсітэтам. Абітурыентам прапаноўваюцца тры спецыяльнасці: «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Фізіка (вытворчая дзейнасць)» і «Сусветная эканоміка». Прыём будзе праходзіць паводле правілаў прыёму ва ўстановы вышэйшай адукацыі Беларусі і згодна з умовамі прыёму на аналагічныя спецыяльнасці БДУ.

Таксама ўпершыню за многія гады вядучы ўніверсітэт краіны абвяшчае набор на вячэрнюю форму падрыхтоўкі. Інстытут бізнесу БДУ запрашае абітурыентаў на спецыяльнасць «Бізнес-адміністраванне». Набор на вячэрнюю платную форму складае 20 чалавек.

БДУІР плануе сёлета прыняць 3,5 тысячы першакурснікаў (на 290 больш у параўнанні з папярэднім годам). Набор будзе весціся на 38 спецыяльнасцях, сярод якіх чатыры спецыяльнасці ваеннага факультэта (упершыню сюды змогуць паступаць і дзяўчаты).

Яшчэ адна адметнасць прыёмнай кампаніі ў БДУІР — істотнае пашырэнне і павелічэнне на дзённай форме набору выпускнікоў каледжаў, якія будуць навучацца па інтэграваных планах. На скарочаную форму навучання плануецца прыняць 235 чалавек, з якіх 145 — на бюджэтныя месцы. Летась прыём вёўся на трох, а сёлета — на васьмі спецыяльнасцях на чатырох факультэтах універсітэта.

## ТРЫМАЦЬ СІТУАЦЫЮ ПАД КАНТРОЛЕМ

Прыёмныя камісіі ВНУ будуць прымаць дакументы з 12 да 17 ліпеня. У гэтыя тэрміны вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання сумоўя, — з 12 да 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:

* **з 12 да 31 ліпеня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

* **з 12 ліпеня да 2 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

* **з 12 ліпеня да 4 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Паколькі на падачу дакументаў на «бюджэт» даецца ўсяго шэсць дзён, абітурыентам трэба загадзя выбудаваць дакладную стратэгію дзеянняў. Адразу варта вызначыцца з профілем (магчыма, гэта будуць дзве-тры спецыяльнасці) і ўстановай адукацыі, куды хочацца паступіць. Падаваць дакументы лепш у першыя дні, бо калі ахвотных цягнуць да апошняга акажацца шмат, то конкурсная сітуацыя можа рэзка змяніцца ўжо пасля закрыцця прыёмнай камісіі, і абітурыент мае ўсе шанцы застацца за бортам. А вось сітуацыю з падачай дакументаў і сваё месца ў абітурыенцкім рэйтынгу трэба маніторыць пастаянна: інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У многіх ВНУ конкурс праводзіцца па групе спецыяльнасцяў з адзіным наборам уступных экзаменаў, што дазваляе абітурыентам адчуваць сябе больш спакойна.

> Але калі становіцца відавочна, што шанцаў няма, трэба дзейнічаць. Ні ў якім выпадку не мітусіцца, а захоўваць моцныя нервы і ясную пазіцыю. Не варта шукаць шчасця ў іншых профілях, трэба спрабаваць паступіць па выбраным, на даўно ўпадабаную спецыяльнасць, магчыма, у іншым універсітэце, дзе меншы конкурс.

У апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне!

## ДАДАТКОВЫ ШАНЦ

18 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

Уступныя выпрабаванні пройдуць:

* **з 18 да 21 ліпеня** — ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

* **з 18 да 26 ліпеня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

* **з 18 да 24 ліпеня** — у іншых ВНУ.

* **з 18 да 25 ліпеня** — у ВНУ сельскагаспадарчага профілю пры паступленні на дзённую форму навучання.

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: да 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, да 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.

Яшчэ адзін шанц, якім абітурыенты могуць скарыстацца, гэта дадатковы набор на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантныя. На іх змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў **з 26 да 28 ліпеня** (залічэнне да 30 ліпеня), у творчых ВНУ — **з 30 да 31 ліпеня** (залічэнне па 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — **з 30 ліпеня да 1 жніўня** (залічэнне да 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў — да 2 жніўня, у творчых ВНУ — да 3 жніўня, у іншых ВНУ (акрамя завочнай формы навучання ў сельскагаспадарчых ВНУ) — да 6 жніўня.

Як сёлета ўкамплектуюцца вышэйшыя навучальныя ўстановы, як укамплектуюцца педагагічныя і інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці, як будуць запаўняцца платныя месцы, даволі цяжка спрагназаваць. Колькасць абітурыентаў, якія зарэгістраваліся на ЦТ, аказалася на 7 % меншай, чым летась (76 888 чалавек). Больш за тое, гэта самы нізкі паказчык за апошнія шэсць гадоў.

А вось колькасць тых, хто не змог пераадолець устаноўлены мінімальны парог на ЦТ, будзе намнога меншая. Пасля ўкаранення новай сістэмы падліку балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні ўстаноўленае абмежаванне ў 10, 15 і 20 балаў (у залежнасці ад дысцыпліны)ператварылася ў звычайную фармальнасць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ❍ Будзь у курсе!

**Для аператыўнага рэагавання на звароты абітурыентаў і іх бацькоў па пытаннях уступных экзаменаў працуе тэлефон «гарачай лініі» рабочай групы Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у Мінску (017) 327 66 80 і тэлефон «гарачай лініі» Міністэрства адукацыі «Абітурыент-2019» (017) 222 43 12.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат», в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А., в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: **кафе общей площадью 56,5 кв. м с инв. № 240/С-45534, расположенное на земельном участке площадью 0,0313 га с кадастровым номером 223655400001000662 (право постоянного пользования) по адресу: Витебская область, Оршанский район, г. п. Копысь, ул. Ленинская, 13.**

**Начальная цена** (без НДС) – **4 950,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **495,00** бел. руб.). **Начальная цена снижена на 50 %.**

Лот № 2: **магазин № 16 общей площадью 100,1 кв. м с инв. № 240/С-45291, расположенный на земельном участке площадью 0,0408 га с кадастровым номером 223687100801000118 (право постоянного пользования) по адресу: Витебская область, Оршанский район, Устенский с/с, д. Белево, ул. Центральная, 4.**

**Начальная цена** (без НДС) – **6 550,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **655,00** бел. руб.). **Начальная цена снижена на 50 %**;

Шаг аукциона – 10 (десять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 (трех) банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются условиями о проведении торгов, ознакомиться с которыми можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 12.06.2019.

Аукцион состоится **30.07.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Борисовдрев» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом** имущества в составе:

**деревообрабатывающий цех, инв. № 610/С-29193, общей площадью 1 207 кв. м, ремонтная мастерская № 1, инв. № 610/С-29199, общей площадью 1 156 кв. м, котельная, инв. № 610/С-29213, общей площадью 151 кв. м, операторская будка (АЗС), инв. № 610/С-59658, общей площадью 16,2 кв. м, здание пульта управления, инв. № 610/С-59659, общей площадью 32.8 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 640400000120000456 площадью 4,8674 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**контора, инв. № 610/С-29182, общей площадью 398 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 640400000012000455 площадью 0,2575 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**трансформаторная подстанция № 1, инв. № 610/С-57102, общей площадью 63,6 кв. м, трансформаторная подстанция № 2, инв. № 610/С-57103, общей площадью 63,3 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100012001194 площадью 0,0257 га по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 29;**

**забор (ограждение) с инв. № 01120008;**

**водопроводная сеть с инв. № 610/С-59810;**

**трансформаторная подстанция ТМ630/10-7041 с инв. № 01340432;**

**трансформатор силовой ТМ630/10 с инв. № 01340434.**

**Начальная цена объектов** с НДС (20 %) – **480 307,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены **– 48 030,70 бел. руб.). Цена снижена на 20 % от начальной стоимости.**

**Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 14.06.2019.

Аукцион состоится **23.07.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Сямейная газета
Выпуск № 11 (126)

## НА РОЎНЫМ МЕСЦЫ

*Колькі дзіця не пільнуй, аднак, калі вышэйшыя сілы падарылі яму ў здаровым целе гарэзлівы дух, цікаўнасць і неўтаймоўную прагу дзейнасці, — знаёмства з навакольным светам без гузакоў, драпін і разбітых насоў не абыдзецца.*

*Што далёка хадзіць: мае бацькі дагэтуль прыгадваюць, як пасярод белага дня патэлефанавала выхавацелька (гаворка, на хвілінку, ідзе пра дамабільную эпоху, так што тэлефанавала маме на работу) і дрыжачым голасам распавяла, што я, чатырохгадовае паслухмянае дзяўчо, разбіла галаву. І дзе? На прагулцы, на лесвіцы ў дзве з паловай прыступкі, знаёмых да апошняй шчарбінкі, практычна на вачах ва ўсёй групы і дзвюх (!) выхавацелек — за нейкае імгненне. Мама ляцела ў садок на таксі, а адтуль, ужо са мной — у бальніцу, дзе рану тэрмінова прамылі і зашылі. І хоць я нічога з гэтага не памятаю, маленькі шнар у раёне патыліцы прымушае паверыць, што так і было.*

*Альбо ўзяць паездкі да бабулі: кожны раз нам, малым, чыталі інструктаж па тэхніцы бяспекі: да мора ісці цераз чыгуначны мост, трымацца за парэнчы, глядзець пад ногі. І кожны раз на другі ці трэці дзень канікул я збівала да крыві вялікі палец на назе — то левай, то правай...*

*Цяпер эстафету няўклюднасці падхапілі ўжо мае дзеці. Малодшая дачка ўмудрылася аднойчы рассячы брыво, проста забіраючыся на свой ложак і няцвёрда паставіўшы нагу, прычым, што асабліва крыўдна, здарылася гэта акурат 8 сакавіка! Старэйшая ж, паколькі любіць летуценна марыць услых і чытаць на хаду, часцяком паўтарае мае дзіцячыя «дасягненні» па сутычках з прадметамі мэблі. Сёлета за менш як палову канікул у нашым актыве падрапаныя падбародкі, некалькі разоў пацарпелыя каленкі і разбітая губа. І ўсё, лічы, на роўным месцы! Пры тым, я ведаю, гэта яшчэ даволі сціплыя вынікі. Знаёмая мама хлопчыка-падлетка неяк у роспачы падзялілася, што ва ўзросце пяці-сямі гадоў наведвала з малым траўмапункт, як па раскладзе — амаль кожны тыдзень! «Спачатку было нават сорамна перад урачамі, як гэта я не магу дагледзець дзіця. А потым пажылая доктарка па-філасофску заўважыла, што ёсць такая катэгорыя людзей — і дзяцей, і дарослых, — якіх хоць у круглы пакой з абабітымі ватай сценамі пасадзі, яны знойдуць чым параніцца альбо прыдумаюць небяспечны для жыцця і здароўя эксперымент. І мяне неяк адпусціла гэта штосекунднае напружанне — я стараюся быць побач, але пэўныя наступствы дурных учынкаў дазваляю яму адчуць на сабе».*

*Многія дзеці не вераць у прапісныя ісціны і правілы, хоць і чуюць іх штодня па шмат разоў. А таму не раз і не два, і з сямю нянькамі, і на роўным месцы, і ў самых найбяспечных умовах што-небудзь такое выкідваюць, што не ведаеш — плакаць, смяяцца ці вырываць сівыя валасы. Што тут будзеш рабіць? Уздыхнеш, апрацуеш «баявыя раны», нальеш у кубак любімую гарбату з чымсьці заспакаяльным, сто першы раз паўторыш, што такое добра, а што такое дрэнна, і прабурчыш амаль бязгучна: «Нічога, у цябе некалі таксама будуць дзеці...»*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

# САВА ЖАДАННЯЎ І ВЕРШНІК НА КАЧЦЫ

Гісторыі ў кераміцы — цацках, акарынах і брэндавых «крычаўскіх коніках»



Фота Андрэя САЗОНАВА.



**Ён навучыў яе ляпіць з гліны, а яна паказала яму сялянскую працу. Сустрэўшыся аднойчы на занятках па ганчарным майстэрстве, Вячаслаў Якавенка і Любоў Яшчанка пайшлі па жыцці разам і ідуць так ужо дзесяць гадоў. Увесь гэты час яны адраджаюць майстэрства крычаўскай глінянай цацкі і ствараюць незвычайных соў, што самі абіраюць сабе гаспадароў, якім патрэбна дапамога.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Школа выхавання

# КАЛІ МЫ ХОЧАМ ЖЫЦЬ ПА-КАРАЛЕЎСКУ

Кансультант па этыкеце, выпускніца Аўстрыйскай вышэйшай школы этыкету расказвае, як правільна пабудаваць узаемаадносіны ў сям'і і выхаваць дзяцей згодна з правіламі



**Таццяна ГЛАДКАЯ — журналіст па адукацыі, працавала на беларускім тэлебачанні ў якасці рэжысёра, сцэнарыста і тэлевядучай. Аднойчы, распрацоўваючы чарговую тэму для сваёй аўтарскай рубрыкі, дзяўчына зразумела, што тэма этыкету развіта ў нас у краіне вельмі слаба, і ў літаральным сэнсе «захварэла» гэтым. Таму і паступіла ў Аўстрыйскую вышэйшую школу этыкету — там Таццяна вучылася ў такіх вядомых спецыялістаў, як Ксенія Ферзь, Марыя Бушэ, прынцэса Таня дэ Бурбон-Пармская, графіня Мары дэ Цілі. Пасля чаго атрымала дыплом і стала кансультантам па свецкім і дзелавым этыкеце. У інтэрв'ю «СГ» Таццяна Гладкая расказала, як правільна навучаць этыкету дзяцей, у што адзявацца дома, як паводзіць сябе з бацькамі і пра шмат што іншае.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# Пра страхавы стаж і адказнасць за неатрыманне пенсіі

**На пытанні нашых чытачоў адказваюць спецыялісты ўпраўлення пенсій і дапамог камітэта па працы Мінгарвыканкама.**

***— Што такое страхавы стаж і якія віды дзейнасці ўключаюцца ў яго? Калі патрэбны страхавы стаж адсутнічае, ці прызначаецца які-небудзь від пенсіі?***

Страхавы стаж — гэта перыяды работы (ці іншай дзейнасці) з выплатай абавязковых страхавых унёскаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Пры гэтым варта мець на ўвазе, што ўмова выплаты абавязковых страхавых унёскаў у ФСАН прымяняецца ў дачыненні да перыядаў работы пасля 1 ліпеня 1998 года. Дакументальна пацверджаныя перыяды работы, якія мелі месца да гэтай даты, уключаюцца ў стаж працы, у тым ліку і ў страхавы стаж, без дадатковага пацвярджэння факта выплаты абавязковых страхавых унёскаў у ФСАН.

Іншыя віды дзейнасці, якія падлягаюць уключэнню ў працоўны стаж для прызначэння пенсіі, напрыклад, вучоба на дзённай форме атрымання адукацыі, служба ў арміі, адпачынак па доглядзе за дзіцем і догляд за дзецьмі да дасягнення імі ўзросту 3 гадоў (але не больш за 9 гадоў увогуле), догляд інваліда I групы або дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама за састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту і мае патрэбу па заключэнні МРЭК або дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя ў пастаянным доглядзе, атрыманне дапамогі па беспрацоўі (але не больш за шэсць месяцаў увогуле) і некаторыя іншыя ў страхавы стаж не ўключаюцца.

Што датычыцца адказу на другое пытанне, то, калі неабходны страхавы стаж адсутнічае, то права на працоўную пенсію грамадзянін не атрымлівае, але яму можа быць прызначана сацыяльная пенсія — жанчынам пасля дасягнення 60-гадовага ўзросту, мужчынам — у 65 гадоў. Памер яе складае 50 працэнтаў ад велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ) і з 1 мая 2019 года гэта 112,01 руб.

* * *

***— Калі дакументы для прызначэння пенсіі пададзены ва ўпраўленне сацыяльнай абароны са спазненнем, ці прадугледжана адказнасць работадаўца за несвоечасовае афармленне дакументаў і ў чым яна заключаецца?***

Пенсія не прызначаецца аўтаматычна. Яе прызначэнне носіць заяўляльны характар, таму, каб рэалізаваць сваё права на пенсію, вы павінны звярнуцца з адпаведнай заявай ва ўпраўленне сацыяльнай абароны. Калі вы працуеце, то абавязак па афармленні дакументаў, неабходных для назначэння пенсіі, і іх прадстаўленні ў названыя органы ўскладзены заканадаўствам на работадаўца па месцы апошняй работы.

Работадаўцы нясуць матэрыяльную адказнасць перад пенсіянерам за шкоду, прычыненую несвоечасовым і няпоўным афармленнем дакументаў, неабходных для назначэння і пераразліку пенсіі, а таксама прадстаўленнем дакументаў, якія змяшчаюць недакладныя звесткі.

Такім чынам, калі ў сувязі з няпоўным і несвоечасовым афармленнем дакументаў вам нанесены матэрыяльны ўрон, які выказаўся ў неатрыманні пенсіі альбо яе атрыманні ў меншым памеры, вы маеце права звярнуцца непасрэдна да работадаўца для яго кампенсацыі ў добраахвотным парадку альбо падаць іск у суд для аднаўлення парушанага права і спагнання недаатрыманых сум пенсіі.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Без гвалту

# ВЫХАВАННЕ І ПАКАРАННЕ

## Ці магчыма зрабіць стасункі ў сям'і больш гуманнымі

**65 % маленькіх беларусаў падвяргаліся ў сям'і гвалту — фізічнаму або псіхалагічнаму. Пры гэтым 8 % апытаных бацькоў лічаць гэта нормай. Такая статыстыка была агучана ў Мінску на круглым стале «Бацькоўства-2019», за якім сабраліся прадстаўнікі грамадскіх і рэлігійных арганізацый, педагогі і псіхіятры.**

— Толькі каля 33 % дзяцей у Беларусі выхоўваюцца ў сям'і без гвалту, а бацькі размаўляюць з дзіцем праз просьбы і тлумачэнні, — сказала **галоўны спецыяліст Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі Юлія ПАНАСЕНКА.** — Падчас даследавання спецыялісты высвятлялі, якія метады ўздзеяння выкарыстоўваюць дарослыя пры выхаванні дзяцей ва ўзросце ад 2 да 14 гадоў. Для апытання ў сям'і выбіралася адно дзіця. Даследаванне паказала, што найбольшая колькасць дзяцей падвяргаліся псіхалагічным метадам выхавання, а 34 % — фізічным пакаранням. Пры гэтым толькі 8 % рэспандэнтаў заявілі, што да дзяцей трэба ўжываць фізічнае пакаранне. Гэта адлюстроўвае супярэчлівасць паміж поглядамі і дзеяннямі дарослых.

Увогуле, усю тэматыку круглага стала можна было аб'яднаць слоганам: «Біць або не біць?» Гэта яскрава сведчыць: частка грамадства яшчэ не ўпэнена ў тым, што можна пазбегнуць гвалту пры выхаванні дзяцей.

### СЯМ'Я СТРАЧВАЕ ЎПЛЫЎ

— Мы гатовыя пачуць усе пункты гледжання на гэтую тэму,— сказаў падчас свайго выступлення **дырэктар сацыяльна-асветніцкай установы «Бацькоўства» Аляксандр ВЯЛІЧКА.** — Сёння яе актуальнасць не толькі расце, а ператвараецца ў нейкую «балючую зону» як у грамадскай прасторы, так і ў дзяржаўных структурах.

Грамадскі дзеяч лічыць, што сёння роля сям'і паступова выцясняецца з працэсу выхавання дзяцей. Яе перакладаюць на школу, органы апекі і правапарадку. А грамадства, грунтуючыся на негатыўных прыкладах нядобрасумленных бацькоў, абагульняе гэты вопыт і на яго падставе стварае мадэлі выхавання, якія ўсё менш разглядаюць сям'ю як цэнтр выхаваўчага працэсу, адцясняюць яе на перыферыю і абмяжоўваюць сферай матэрыяльнага забеспячэння.

— Але мы ўпэўненыя, што менавіта сям'я павінна заставацца цэнтрам выхавання дзяцей, — тлумачыць Аляксандр Вялічка. — Па-першае, таму што сям'я найбольш зацікаўленая ў шчаслівай будучыні дзіцяці. Па-другое, у школе на аднаго педагога прыходзіцца ад 10 да 35 дзяцей, і першыя проста не здольныя забяспечыць належны індывідуальны ўплыў на другіх. Сем'ям лепш дапамагаць у пытаннях выхавання, а не ўмешвацца ў гэты працэс. Тым больш што інстытут сям'і валодае велізарным досведам у выхаванні, які варта выкарыстоўваць, а не правяраць на трываласць. Выходзіць, што адказнасць за дзяцей, у тым ліку юрыдычная, узрастае, але ў той жа час правы, якія забяспечваюць рэалізацыю такой адказнасці, з кожным годам скарачаюцца. Сям'я нібыта страчвае ўплыў на дзіця.

Канешне, ёсць і такая праблема як злоўжыванне бацькоўскай уладай і правамі. Але гэта было і будзе не толькі ў сферы выхавання, а ў любых сферах грамадства. Будаваць сістэму ўзаемаадносін, сыходзячы з сістэмы каштоўнасцяў невялікай часткі нашага грамадства як мінімум няправільна, — лічыць актывіст.

— Выхаванне дзяцей трымаецца на трох кітах, — дадае Аляксандр Вялічка. — Гэта, па-першае, асабісты прыклад, па-другое — заахвочванне і адабрэнне, па-трэцяе — карэкцыя і дысцыплінаванне. Грэбаванне адным з гэтых метадаў прыводзіць да дысбалансу выхаваўчага працэсу. Сёння патрабуецца пераасэнсаванне традыцыйнай мадэлі сям'і адносна сучасных грамадскіх рэалій і замацаванне прыярытэтных бацькоўскіх функцый у сям'і.

### НЕ МЕТАД, А АКТ АДЧАЮ

— Самае бяспечнае месца для дзіцяці — гэта яго сям'я, але ў той жа час усё часцей менавіта ў сям'і мы бачым акты гвалту ў дачыненні да дзяцей, — заявіла **галоўны пазаштатны дзіцячы псіхіятр Міністэрства аховы здароўя Вольга ЛІТВІНАВА.** — Трэба разумець, што дзеці вельмі ўразлівыя. Дзіця ўспрымае як норму ўсё, што з ім адбываецца ў сям'і. І калі на яго вачах адбываецца гвалт, нават не ў адносінах да яго, а паміж дарослымі, яно пачынае ўспрымаць гэта як варыянт нормы, пакуль само не вырасце.

Псіхіятр удакладніла, што ў кожнага чалавека ёсць свая ўласная мадэль выхавання, якая перадаецца з сям'і ў сям'ю. Вынікі даследавання паказалі, што многія бацькі нават не разумеюць, што здзяйсняюць акты гвалту.

Спецыяліст растлумачыла, што гвалт бывае розны — фізічны, сексуальны, псіхалагічны, ды нават пакінуць дзіця ў небяспецы таксама гвалт. Любое насілле выклікае страх. Страх — самая старажытная эмоцыя стрэсу. Падчас стрэсу ўсе сілы дзіцяці ідуць не на развіццё, а на тое, каб зберагчы сябе і выжыць. Такія дзеці звычайна замкнутыя, у іх часта здараюцца дэпрэсіі, не складваюцца адносіны з аднагодкамі.

**Вынікі даследавання паказалі, што многія бацькі нават не разумеюць, што здзяйсняюць акты гвалту.**

— Дарослыя, якія ігнаруюць дзіця эмацыянальна ці караюць яго фізічна, часта проста не ведаюць іншых метадаў уздзеяння, — лічыць спецыяліст. — Выхаванне і пакаранне без гвалту магчымае! Яно грунтуецца на безумоўнай любові да дзіцяці. Малое павінна разумець, што яго любяць не за добрыя адзнакі і добрыя ўчынкі, а таму што, яно ёсць у гэтай сям'і. Кожнае дзіця ўнікальнае і мае права рэагаваць на жыццё не так, як яго бацькі.

Але што рабіць, калі бацькі ўсё ж выпусцілі дзіця з-пад увагі і яму ўжо неабходна карэкцыя паводзінаў? Псіхіятр лічыць: першае, што неабходна зрабіць у такіх выпадках бацькам, — прызнаць сваю памылку, а не біць дзіця. А потым пачаць вучыцца прымяняць да дзіцяці негвалтоўныя метады выхавання.

З чым былі згодныя ўсе ўдзельнікі круглага стала, дык гэта з тым, што часта бацькі проста не ведаюць такіх метадаў.

Таму перад тым як зрабіць адказнасць бацькоў больш жорсткай, неабходна спачатку накіраваць высілкі на павышэнне адукаванасці дарослых у выхаванні дзяцей. Толькі такім чынам можна панізіць градус насілля ў сем'ях.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

**Да ведама**

**На пачатак 2019 года ў нашай краіне было каля 1,9 млн дзяцей, з іх 80 % жывуць у горадзе. Летась нарадзілася 94 тысячы дзяцей. У тым ліку ў незарэгістраваным шлюбе — 12 тысяч дзяцей, або 13 % ад агульнай колькасці. У сельскай мясцовасці дзеці па-за шлюбам нараджаюцца часцей, чым у горадзе. У большасці сваёй маці на момант нараджэння дзіцяці было ад 30 да 34 гадоў.**

**У краіне па-ранейшаму высокая статыстыка па разводах: на два шлюбы прыходзіцца адзін развод. У 2018-м распалася 33 тысячы сем'яў, з іх 58 % — сем'і з дзецьмі.**

**У 2018 годзе ад знешніх прычын загінула 135 дзяцей, у параўнанні з 2005-м колькасць паменшылася ў тры разы.**



# КАЛІ МЫ ХОЧАМ ЖЫЦЬ ПА-КАРАЛЕЎСКУ



## «ЗАЎСЁДЫ ТРЫМАЦЬ СЯБЕ ГОДНА — САПРАЎДНАЕ МАСТАЦТВА»

***— Таццяна, для пачатку раскажыце, чаму вы пачалі так старанна вывучаць этыкет?***

— Працуючы на тэлебачанні, для спецыяльнай рубрыкі я прыдумала гумарыстычныя па выкананні, але сур'ёзныя па змесце сюжэты, якія і зараз можна знайсці ў Сеціве. Гэта ролікі на даволі бытавыя тэмы: як паводзіць сябе ў тэатры, у грамадскім транспарце, на пляжы, як культурна мець зносіны з суседзямі. Браць інфармацыю толькі з інтэрнэту было не камільфо, таму я пачала чытаць літаратуру, збіраць сваю бібліятэку, наведваць розныя майстар-класы, куды прыязджалі французскія і англійскія велікасвецкія дамы. А нядаўна скончыла курс у Аўстрыйскай школе і атрымала дыплом. Навучанне там ішло адразу па некалькіх кірунках: свецкі, дзелавы і сталовы этыкет. Я абрала менавіта гэтую школу, таму што мне вельмі блізкая іх «рэлігія» — элегантнасць ва ўсім. Яны прапагандуюць, што можна быць элегантным нават у старым бабуліным світары і джынсах. У першую чаргу, элегантным павінна быць не адзенне, а менавіта манеры, жэсты, звычкі і гаворка. Вельмі важна заставацца элегантным у крытычных, форс-мажорных сітуацыях. Калі нам хтосьці нахаміў або калі мы не ў настроі, калі, можа быць, адбылося нешта вельмі сумнае. Трэба заўсёды трымаць сябе годна. І гэта сапраўднае мастацтва.

***— Наколькі тэма этыкету развіта ў нашым грамадстве?***

— Яна, на жаль, развіта недастаткова, а самае сумнае, што часта правілы этыкету ў нас успрымаюцца варожа. Многія, напрыклад, лічаць, што лішняе «дзякуй», «добры дзень», «да пабачэння» — гэта як лакейства, прыніжэнне перад чалавекам, якому ты так гаворыш. Вядома, ёсць тэндэнцыі да лепшага, людзі больш вітаюцца з касірамі, суседзямі, але пры гэтым апускаюць вочы і галаву. Пра ўсмешку наогул можна забыцца. Гаворачы аб этыкеце, заўсёды трэба пачынаць з сябе і разумець, што этыкет — гэта не нейкія забароны або правілы, якія нас абмяжоўваюць, а наадварот — тое, што дае нам свабоду. Я для сябе вывела такую формулу: этыкет — гэта тры словы: камфорт, свабода і зручнасць. Калі мы ведаем правілы таго, як мець зносіны, правілы сталовага этыкету, нам камфортна. Не трэба нервавацца з нагоды таго, як есці амара. Мы можам свабодна весці гутарку з дзелавым партнёрам, камфортна сябе адчуваць на спатканні. А камфорт дае нам свабоду выбару. Культура зносін — гэта праца, спачатку вельмі няпростая. Нашмат складаней у аўтобусе, саступаючы месца бабулі, сказаць: «Сядайце, калі ласка!», чым проста ўстаць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Вядома, накладае адбітак савецкі час, калі правілы этыкету трактаваліся абсалютна няправільна. Напрыклад, да гэтага часу ў дзіцячым садку дзецям кажуць: «калі я ем, я глухі і нямы». Лухта несусветная! За святочным абедам я гавару і слухаю згодна з этыкетам, таму што за сталом у сям'і ці кампаніі трэба ўмець размаўляць. Таксама няправільна трактуецца правіла, што нельга ставіць локці на стол. На самай справе, локці на стол ставіць можна, але не заўсёды. Можна, напрыклад, падчас змены страў і ў той час, калі ўжо падалі гарбату або каву. Таксама гэта дапускаецца ў выпадку, калі стол не серціраваны. Усё лагічна, таму што ў гэты час на стале няма прыбораў, на гэта месца можна паставіць локці. Локці на стале дапускаюцца ў неафіцыйнай абстаноўцы — у сямейным асяроддзі ці на сустрэчы з сяброўкамі.

## «ГАЛОЎНАЕ ПРАВІЛА — ГЭТА ПАВАГА»

***— Ці ёсць паняцце «сямейны этыкет»?***

— Вядома, бо сям'я — гэта грамадства, прычым, я лічу, гэта галоўнае грамадства, бо ўсё, што адбываецца ў сям'і, потым транслюецца ў іншыя сферы жыцця: у работу, у зносіны з сябрамі, з незнаёмымі людзьмі. Усе правілы этыкету павінны пачынацца ў сям'і. З таго моманту, як дзіця пачынае штосьці разумець, трэба вучыць яго гаварыць «дзякуй», «калі ласка», пытацца дазволу, перш чым штосьці ўзяць ці штосьці зрабіць. А галоўнае — заўсёды ўсё трэба паказваць на сваім прыкладзе, без гэтага ніякія правілы этыкету не спрацуюць.

***— Ёсць правілы, якія павінны выконваць члены сям'і ў адносінах адзін да аднаго?***

— Галоўнае правіла — гэта павага і захаванне асабістай прасторы. Павага — шырокае паняцце, нават у плане дамашняга адзення. Гэта наогул балючая тэма для беларусаў. Чамусьці мы думаем, што дома можна дазволіць сабе хадзіць у чым заўгодна, але гэта нават і не лагічна. Накіроўваючыся на шпацыр, на работу ці на сустрэчу з сябрамі, мы спрабуем надзець усё самае найлепшае і прыгожае для адпаведнай абстаноўкі, таму што хочам спадабацца людзям, заваяваць павагу. Потым прыходзім дадому і апранаем расцягнутую майку. Гэта катэгарычна няправільна, трэба паважаць членаў сям'і і заставацца дома прыгожымі і дагледжанымі. Мінімум крытэрыяў, якія датычацца да хатняга адзення: яно павінна быць чыстым, цэлым і мець прыстойны выгляд. Я не маю на ўвазе бальную сукенку, але гэта могуць быць кашуля, штаны, шорты або нават майка, але добрая, чыстая, прыгожая. Ніколі не дапушчальна хадзіць мужчыну з голым торсам па хаце або любому члену сям'і ў лазневым халаце. Калі мы хочам выхаваць у нашых дзецях пачуццё густу, стылю і заўсёды ў вачах жонкі або мужа выглядаць вытанчана, трэба паклапаціцца аб хатнім адзенні.

Другое правіла — заўсёды трэба лічыцца з думкай жонкі або мужа, а таксама дзіцяці. Заўсёды трэба шукаць кампрамісы. Ніколі нельга ў сям'і лаяцца на кагосьці пры чужых людзях, нават жартам вінаваціць жонку ці мужа ў чым-небудзь пры гасцях. Гэта прыніжэнне. Таксама ніколі нельга высвятляць адносіны за межамі дому, не толькі лаяцца, але і праяўляць лішнія станоўчыя эмоцыі на людзях — такія, як каханне, страсць. Цалавацца ў парку, кіно, рэстаране — маветон. Вядома, ёсць сітуацыі, калі трэба выплеснуць эмоцыю. Напрыклад, калі закаханыя доўга не бачыліся адно аднаго. У гэтым выпадку дапушчальныя гарачыя абдымкі і адзінкавы пацалунак.

Трэба таксама паважаць сваіх дзяцей: напрыклад, з таго часу, калі дзіця ўжо стала школьнікам, трэба стукацца ў яго пакой, перш чым увайсці.

***— Пры якіх размовах бацькоў дзіця можа прысутнічаць, а пры якіх — не?***

— Бацькам недапушчальна высвятляць адносіны пры дзіцяці, больш за тое, ніколі не трэба казаць пра маму ці тату штосьці дрэннае, дзіця не павінна быць інструментам разборак.

Дзіця можа прысутнічаць пры ўсіх звычайных, важных і пазітыўных размовах, калі сям'і трэба прыняць якое-небудзь рашэнне, напрыклад, паедуць яны сёлета адпачываць у Егіпет ці ў Турцыю. Трэба слухаць дзіця, безумоўна, і прымаць яго думку. Калі яна здаецца бацькам вар'яцкай з прычыны ўзросту, можна паспрабаваць растлумачыць, чаму зараз мы не можам так зрабіць. Але ні ў якім выпадку не гаварыць: «Божа, якую бязглуздзіцу ты нясеш», ці «Ты яшчэ маленькі, нічога ў гэтым не разумееш».

**«Нашмат складаней у аўтобусе, саступаючы месца бабулі, сказаць: «Сядайце, калі ласка!», чым проста ўстаць».**

***— Як пачынаць расказваць дзецям аб правілах этыкету, з якога ўзросту?***

— Калі яны ўжо разумеюць, што такое «дзякуй». У прынцыпе, з дзіцячага садка ўжо можна пачынаць, таму што вельмі многае закладваецца ў чалавеку менавіта ў дзіцячым садку выхавальнікамі, нянечкамі. Я лічу, што правілы этыкету павінны быць у кожным дзіцячым садку, у кожнай школе, ва ўніверсітэце, ды і ў кожным офісе, таму што вучыцца нам трэба яшчэ шмат.

Вучыць дзяцей трэба абавязкова ў гульнявой форме. Зараз я пачынаю навучаць дзетак этыкету ў адным з прыватных дзіцячых садкоў. Там мы распрацавалі спецыяльную праграму, дзе малыя, гуляючы, самі будуць стварыць сітуацыі для навучання. Самыя маленькія (ад трох гадоў) будуць выкарыстоўваць свае любімыя цацкі, саджаць іх за стол і разбіраць, што і як рабіць падчас яды. Для тых, хто трохі старэйшы (чатырыпяць гадоў), мы прыдумалі розныя квэсты-сітуацыі, падчас якіх дзеці будуць трапляць у казачнае каралеўства добрых манер. Наша мэта — з садка навучыць дзяцей паважаць усіх: нянечку, кантралёра, любога мінака. Увогуле мэта этыкету — навучыць дзяцей паважаць, разумець і дзякаваць.

***— Многія бацькі схільныя да таго, каб выхоўваць дзіця ў грамадскім месцы.***

— Гэта зусім недарэчна. Усім раю запомніць фразу: «Дома пагаворым!» І старацца стрымліваць свае эмоцыі ў грамадскіх месцах. Таксама ніколі нельга рабіць заўвагі чужым дзецям. Гэта можна рабіць толькі ў выглядзе кампліменту. Напрыклад, калі нейкае дзіця нам перашкаджае, бегаючы на пляжы або ў самалёце, можна яму сказаць: «Ты такі класны, ты так гуляеш, давай я з табой пагуляю?» Хутчэй за ўсё, яно супакоіцца і стане паводзіць сябе па-іншаму. Або сказаць яго бацькам: «У вас такі актыўны хлопчык, так выдатна бегае!» Нармальны чалавек зразумее, што трэба абмежаваць перасоўванне свайго дзіцяці.

Цяпер лета, таму хацелася б закрануць тэму пляжаў і папрасіць бацькоў паважаць сваіх дзетак. Многія думаюць, што на пляжы, на дачы, каля басейна малым можна хадзіць увогуле без адзення. Нельга! Ніколі! Этыкет забараняе. Паўтаруся, трэба паважліва ставіцца да сваіх дзяцей і хаваць іх гендарную прыналежнасць.

## «УСЁ НАЙЛЕПШАЕ ДЗЯДУЛЯМ І БАБУЛЯМ»

***— Якія правілы этыкету рэкамендуецца выконваць у дачыненні да старэйшага пакалення?***

— Існуе такое выказванне — усё найлепшае дзецям. Я не згодна з ім абсалютна! Усё найлепшае павінна дастаавацца бацькам, дзядулям і бабулям. Яны заўсёды павінны садзіцца на лепшыя месцы ў машыне, аўтобусе, за сталом. Заўсёды трэба пытацца, калі дзядулі і бабулі змогуць прыехаць на вяселле ці на чыйсьці юбілей. І імкнуцца па магчымасці падладзіцца менавіта пад іх. Ніколі дзеці не павінны быць вызначальным фактарам на сямейных урачыстасцях, увага павінна надавацца ў першую чаргу людзям элегантнага ўзросту. Яны гэта заслужылі, бо часцей за ўсё гадуюць не толькі нас, але і нашых дзяцей.

***— Ці дарэчы ў зносінах ужываць словы «цешча», «свякроў», «нявестка»?***

— У прысутнасці людзей, якія з'яўляюцца гэтымі сваякамі, вядома, не. Гэта прастамоўныя словы. Думаю, што англійская каралева не скажа: «Вось, гэта мая нявестка». А калі мы хочам жыць па-каралеўску, давайце паводзіць сябе па-каралеўску. Калі, дапусцім, мы камусьці прадстаўляем цешчу, лепш сказаць: гэта Наталля Міхайлаўна, мама маёй жонкі.

***— Бацькі часта спрабуюць умешвацца ў маладыя сем'і і ў жыццё сваіх дзяцей. Як правільна абмежаваць сваю прастору?***

— Па магчымасці, вядома, трэба жыць асобна. Калі гэта не так, пастарайцеся ніколі не грубіяніць і не выходзіць з сябе, хоць гэта можа быць і складана. Абмяжоўваць сваю прастору трэба заўсёды ветліва дзякуючы, напрыклад, казаць: «Мама, тата, я вельмі вам удзячны за тое, што вы далі мне параду, я яе ўлічу, але ў мяне ёсць яшчэ такі пункт гледжання...»

**Гутарыла Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# САВА ЖАДАННЯЎ І ВЕРШНІК НА КАЧЦЫ



## Гліна кіруе эмоцыямі

У майстроў ёсць не толькі асобныя фігуркі: коцікаў, конікаў ды людзей, а і званочкі, падсвечнікі, бразготкі... А яшчэ цэлыя гліняныя кампазіцыі, якія складаюцца з некалькіх вырабаў і яднаюцца ў адну тэматычную замалёўку. Гэтыя творчыя наборы фігур пабывалі на шматлікіх выстаўках, дзе майстры неаднаразова займалі першыя месцы.

— Гэта вось «Старадаўні Крычаў XVIII стагоддзя». Замак, суднаверф, недзе яшчэ караблік быў... А гэта «Восень», «Мая малая радзіма»... А гэта я ару поле, — пералічвае **народны майстар Беларусі Вячаслаў ЯКАВЕНКА** свае творы і смяецца, паказваючы на фігурку аратага аўтарства сваёй другой паловы. — Я і за сапраўдным плугам хаджу, і кашу́. Жонка навучыла.

— А карову гэта вы, пэўна, ведзяце? — пытаюся ў **Любові ЯШЧАНКІ, члена Беларускага саюза майстроў народнай творчасці,** гледзячы на іншую фігурку з кампазіцыі.

— А як жа, я, — пагаджаецца яна.

Пакуль размаўляем, Вячаслаў Мікалаевіч робіць чарговага каня, хоць пакуль я бачу ў яго руках толькі гліняны шар. Звычайна майстар заўжды ведае, што наступнае народзіцца ў яго руках, аднак бывае і інакш...

— Часам хочаш зрабіць адно, а гліна дыктуе сваё, і выходзіць такая фігурка, якую і не ўяўляў, — кажа Любоў Яшчанка. — Гліна можа кіраваць чалавекам. Асабліва калі ты заклапочаны прыходзіш. Сядзеш за справу, а гліна нібыта адцягвае на сябе трывогі, супакойвае, камандуе тваімі думкамі, прымушае іх набыць зусім іншы напрамак.

Асабліва ў гэтым дапамагаюць свістулькі. Іграць на іх урачы раяць нават неўраўнаважаным людзям ці гіперактыўным дзецям.

— Калі толькі бярэш гліну ў рукі, пачынаюць узаемадзейнічаць біяпалі чалавека і матэрыялу. Праз хвіліну ў нас ужо рассеяная ўвага. Яшчэ праз пару хвілін біяполе гліны падстройваецца пад наша. Наша аўра і ахоўныя функцыі арганізма ўзмацняюцца, — кажа майстрыха. — А калі вас мучыць нейкае пытанне, дастаткова пайграць на свістульцы. І супакоішся, а мозг сам знойдзе адказ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## І не качка, і не конь

Першыя абярэгі, дарэчы, былі менавіта гліняныя. Старажытнаславянскі абярэг у выглядзе вершніка, што сядзіць на невядомым стварэнні (паўкачка-паўконь), лічыцца сімвалам язычніцкага Падняпроўя — зямлі, якая цяпер уваходзіць у склад Расіі, Украіны і Беларусі. Так што цацка гэтая яднае тры народы. Качка — сімвал ночы і мацярынства — ахоўвала чалавека ў цемры, а конь — сімвал сонца, любові і ўрадлівасці — у светлы час. Такую цацку-свістульку кожны воін абавязкова браў з сабою на бітву. Абярэг ахоўваў таксама паляўнічых і падарожнікаў.





Менавіта гэтая найстаражытнейшая свістулька стала вобразам і брэндам фестывалю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Крычаўскі конік». Сёлета ў верасні ён пройдзе ўжо чацвёрты раз. Адметнасць свістульскай качкі-каня, фігурку якога ўпершыню знайшоў археолаг Андрэй Мяцельскі, у тым, што яна мае галаву каня і тулава качкі. Цацка датуецца XVII стагоддзем.

— 98 фігурак з гліны былі знойдзены на раскопках гарадзішча на Гомельшчыне, якое датуецца другім тысячагоддзем да нашай эры. На жаль, усе яны былі пабітыя, толькі адзін конік застаўся цэлы. На той час гэтыя фігуркі былі сакральнымі рэчамі. Людзі верылі, што сапраўдны конь з'явіцца, калі яго зляпіць. А як цацка свістулька з'явілася ў II стагоддзі нашай эры, — дзеліцца ведамі майстар.

Свістулькі майстроў нібыта жывыя. Яны імітуюць да 20 відаў галасоў і спеваў птушак і жывёл. Пеўнік кукарэкае, конік іржэ, сава вухкае і можа імітаваць зязюлю, качка крякае, птушкі выдаюць трэлі, коцікі мяўкаюць, сабакі гаўкаюць, парасё рохкае, мядзведзі, тыгры і львы рыкаюць, каровы і быкі мычаць, лягушка квакае і пускае пузыры, вадзяны спявае салаўём, калі ў яго наліць вады... Гук свістульцы робяць па памяці — падобным на той, што самі чулі, кажуць рамеснікі:

— Каб у свістульці з'явіўся задуманы голас, патрэбны пэўная таўшчыня сценак і памер дзірачак. Большая форма свістулькі — гук больш глухі, меншая па памерах гучыць званчэй. Выраб з дзвюма-трыма гукавымі адтулінамі — гэта проста свістулька. Калі чатыры і больш, да сямі-васьмі — гэта акарына. На ёй можна сыграць мелодыю і настроіць па нотах.



Сакрэты дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і рамества Вячаслаў Мікалаевіч выкладае і дарослым — у народнай студыі «Добрасць», і малым — у дзіцячай народнай студыі «Свістулька». Многія былыя вучні ўжо самі перадаюць рамяство наступным.

## Абварванне, малачэнне, задымленне...

Вырабы адрозніваюцца не толькі выявай фігуркі, але і знешнасцю. Недзе цацка чорная, задымленая, недзе каляровая, аж зіхаціць, распісаная... Спосабаў абпальвання гліны мноства.

— Распаленую фігурку вымаеш з печы і кладзеш у апілкі. Яны займаюцца, дымяць, і гліна набірае дыму. Пасля цацка не пэцкаецца, становіцца больш цвёрдай і моцнай і грае званчэй, — кажа Любоў Яшчанка. — Гэта вось зроблена шляхам малачэння: распаленую фігурку акунаем у салодкае малако, пасля чаго ставім яе дадаткова на абпальванне і даводзім да 400 градусаў. Атрымліваецца такі цікавы колер. Ёсць таксама абвараная гліна — калі распалены выраб вымаеш з печы і акунаеш у расол, на паветры ідзе акісленне, фігурка пакрываецца плямінкамі. Атрымліваецца такі рабенькі твор, які пасля абавязкова трэба памыць вадою, інакш уся цацка стане чорнага колеру. Ёсць яшчэ ангоб — калі ў адным вырабе спалучаюць розныя віды і колеры гліны.

За адраджэнне прыдняпроўскай глінянай цацкі Вячаслава Якавенку ўзнагародзілі ордэнам Пашаны, а звесткі пра вырабы і майстра занесены ў міжнародную энцыклапедыю «Найлепшыя людзі».

Гістарычная каштоўнасць цацкі не выклікае сумненняў. Што да эканамічнага складніка, то, кажуць майстры, дарога і пражыванне на «Славянскім базары», напрыклад, акупляюцца, аднак зарабляць на жыццё толькі любімай справай не атрымаецца.

— Мы ж не можам рабіць цацкі круглыя суткі. У нас не шырспажыў, а вырабы з душой, — кажа Вячаслаў Якавенка.

— Да нас падыходзяць і з крамаў, і прадпрымальнікі, каб мы ім аддавалі на продаж свае цацкі оптам, аднак мы не пагаджаемся, — падтрымлівае Любоў Міхайлаўна. — Мы і не наробім столькі, і душы ў тых творах не будзе, яе ж толькі рукамі можна ўкласці. Няхай праз камп'ютарныя штампы-малюнкі свістулька і будзе ідэальная, а ў майстра недзе рука хіб зробіць, аднак прамысловая цацка будзе без душы, без энергетыкі!

## Совы мяняюць жыццё

Сава — сімвал мудрасці, сямейны абярэг, заступніца жанчын. Яна наводзіць у хаце парадак, не дае адбыцца сваркам. У хаце сава павінна стаяць навідавоку.

Свістулька-сава ўпершыню з'явілася ў XVIII стагоддзі, калі на Крычаўшчыне было паўстанне Васіля Вашчылы. Яго паплечнік, ганчар Іван Сыч, рабіў не толькі посуд, а і птушак-сычоў, якія дудзелі як сапраўдныя. З тых часоў пачалі рабіць выявы соў... Па павер'і заходніх славян, чэхаў і палякаў, раз на год яна выконвае жаночае жаданне, заўважае майстар.

— На Каляды яна выконвае любое жаданне, на Купалле — пра каханне, на Пакровы можна загадваць пра прыбытак, нараджэнне дзетак. Апоўначы трэба загадаць жаданне, пасвістаць у саву тройчы і легчы спаць, ні з кім не размаўляючы. У хуткім часе жаданне здзейсніцца, — кажа Любоў Міхайлаўна. — Сава і маё жыццё рэзка змяніла... Вячаслаў — мой другі муж, і пазнаёміліся мы з ім праз маю дачку, якая пайшла да яго займацца. Ёй спадабалася настолькі, што яна кінула музычную школу, але мне не прызнавалася. Як толькі дачка зляпіла саву і прынесла яе дадому, дык і я трапіла на заняткі да Вячаслава і пачала сама ляпіць. Перад гэтым некалькі разоў хацела падаць на развод, але нешта мяне ўтрымлівала, ды і ісці не было куды. А тут Вячаслаў прапанаваў: «У мяне кватэра вялікая, прыходзьце з дачкой, пажывіце, колькі трэба». Так мы ў яго і засталіся...

Совы, якіх толькі раз на год, падчас вялікага посту, робіць Любоў Міхайлаўна, валодаюць сапраўднай містыкай. Толькі калі жанчына папасціць і памоліцца, яна бярэцца за справу, інакш сава не набудзе сваіх якасцяў. Вялізная сава, зробленая рукамі Любові Міхайлаўны, «жыве» нават у кіраўніка дзяржавы.

— Нашым пакупнікам я звычайна расказваю павер'і, звязаныя з совамі. Неяк па вясне чарговы раз мы былі на выстаўцы, адна дзяўчына слухала, глядзела і раптам кажа: «Вось гэта, напэўна, мая сава»... У жніўні яна пазваніла і сказала, што цяжарная, хоць дзесяць гадоў у іх з мужам не было дзяцей і ўрачы казалі, што ўжо і не будзе, — успамінае Любоў Яшчанка. — А ў Белградзе адна жанчына слухала мае расказы, пасля заплакала і збегла... Потым вярнулася і бярэ апошнюю саву: «Яна на мяне ўвесь час пазірала»... Праз тры гады я гэтую жанчыну сустрэла ізноў. Яна расказала, што сірата, некалі выйшла замуж за хлопца, бацькі якога на гэтым настаялі, бо яна зацяжарала. Пасля яшчэ двух дзетак нарадзіла, аднак муж здзекаваўся з маладой. А як яна прынесла ў дом саву, ён... праз два дні знік ажно на тры гады. Некалькі месяцаў таму вярнуўся іншым чалавекам... на руках носіць, ва ўсім дапамагае.

Што ж, талент і містыка, напэўна, заўжды побач... «Мая» сава мяне таксама чакае, толькі яе Любоў Міхайлаўна пакуль не зрабіла...

**Ірына СІДАРОК,**
**фота Андрэя САЗОНАВА.**









# Кім МАЗУР: «Слухайце сэрца, а не галаву»

**Вольга і Кім Мазуры — прыгожая, паспяховая пара. Звязала і аб'яднала іх агульная любоў да вандровак і незвычайнай кухні. Скончыўшы факультэт міжнародных адносін, Вольга ў свае 23 гады вырашыла ажыццявіць дзіцячую мару: адправілася ў такую прывабную для яе Паўднёвую Амерыку. Больш за год жыла ў Перу, дзе глыбока прасяклася думкай, што індзейская кухня і культура — гэта нешта асаблівае. Яна збіралася пераехаць жыць на Уругвай, але сустрэла Кіма. З тых часоў сталі падарожнічаць разам. Пабывалі ў Кеніі, Танзаніі, В'етнаме, Камбоджы, Панаме, Мексіцы... А яшчэ яны разам знаёмяць беларусаў з вынаходствамі сусветнай кухні.**

**Ці ёсць універсальны спосаб спадабацца жанчыне? Якія кактэйль ёй прапанаваць? Якія жаночыя звычкі незразумелыя мужчынам? Пра гэта і шмат пра што іншае расказаў рэстаратар папулярных мінскіх бараў «Вінная шафа», «Перасмешнік» і «Аяўаска» Кім Мазур, які паспяхова вядзе бізнес разам з жонкай Вольгай.**

***— Што, на вашу думку, самае прывабнае ў жанчынах?***

— Вочы, таму што яны заўсёды выказваюць непадробленыя эмоцыі. Яны пакажуць, што дзяўчына хоча вам сказаць і чаго не хоча гаварыць, наколькі яна з вамі сумленная і шчырая, ці добра ёй побач з вамі.

У мяне двое дзяцей, дачцэ зараз 17 гадоў. Яна заканчвае школу, і ў яе ёсць свае перажыванні. Хачу, каб яна магла падзяліць іх з блізкімі людзьмі, калі ёй гэта спатрэбіцца. Таму імкнуся ўбачыць у яе вачах, калі я ёй патрэбен, а калі не. Бо ў яе ёсць свая асабістая прастора. Тое, што мне хочацца быць з ёй у дадзены момант, не азначае, што ёй будзе камфортная мая кампанія. Але пры гэтым вельмі важна, каб яна разумела: я заўсёды буду ёй апорай, са мной яна можа адчуваць сябе абароненай.

***— Што вас здзіўляе ў жанчынах?***

— Шапагалізм і прыхільнасць да вялікай колькасці ўбораў. У маёй жонкі неверагодна шмат адзежы, якую яна амаль не носіць. У яе ёсць ашаламляльная чырвоная сукенка, якая ёй вельмі пасуе, але яна апранала яе ўсяго двойчы. Затое ёсць куртка, якую яна носіць гадоў 15 і адмаўляецца мяняць. Нягледзячы на заваленыя паліцы і поўныя адзення вешалкі, кожны раз, калі яна адчыняе гардэробную шафу, усё роўна ўзнікае пытанне: «Што ж надзець?» І кароткае рэзюмэ: «Надзець няма чаго. Трэба купіць нешта новае».

***— Ці ёсць універсальны спосаб спадабацца дзяўчыне?***

— Трэба быць шчырым, але неназойлівым і нічога не патрабаваць, тады, магчыма, атрымаецца выклікаць сімпатыю. Улічваючы розныя погляды на жыццё, розныя характары і менталітэты, нейкага ўніверсальнага спосабу спадабацца, напэўна, няма.

***— Мужчыны цяпер рэдка знаёмяцца першымі...***

— Ведаеце, Беларусь мае неверагодны дар — надзвычайных дзяўчат. І гэты дар тут амаль не шануецца. Вашы мужчыны чамусьці мала захапляюцца імі — я кажу «вашы», таму што я не з Беларусі, — бачаць велізарную колькасць дзяўчат, выдатных ва ўсіх адносінах: па характары, знешнасці, адукацыі, здольнасці да самаадданасці.

Па сваёй службе я некаторы час жыў у розных еўрапейскіх краінах і вельмі рэдка лавіў сябе на думцы, што чыста па-мужчынску праводжу дзяўчыну поглядам. Так, каб «я павярнуўся паглядзець, ці не павярнулася яна...» Не таму, што дзяўчыны там выглядаюць неяк нецікава, проста на эмацыянальным узроўні яны мяне не «чаплялі». Магчыма, таму, што яны жывуць па правілах, быццам ім трэба сапернічаць з мужчынамі...

***— Назавіце самы лепшы «жаночы» кактэйль...***

— French seventy five («Французскі 75»). Пеністы, трохі саладосці ад ванілі, трохі кіслінкі ад цытрыны і трохі-трохі джыну для запалу. Тут усё тое, што трэба дзяўчыне, каб правесці вечар добра *(усміхаецца)*.

***— Самая каштоўная якасць у мужчыны...***

— Уменне натхніць. Ні адзін мужчына не будзе нешта рабіць, калі няма для каго. Жанчыны натхняюць нас на нейкія ўчынкі. У дзяцінстве для мяне гэта была мама, у маладосці — жонка, цяпер і дачка.

Свайго мужчыну трэба акрыляць! Як гэта рабіць — іншае пытанне. У кожнай з маіх жанчын да мяне розны падыход. Але яны ведаюць, што ў мяне можна папрасіць абсалютна ўсё, і я для іх усё зраблю.

***— Чаго ні ў якім разе нельга казаць жанчыне?***

— Нельга грубіяніць. Нельга адмаўляць ёй у жаданні адпачыць, калі яна стамілася ад спраў і клопатаў і хоча расслабіцца. Нельга даваць укісаць. Калі жанчына скардзіцца, трэба абавязкова яе выслухаць і пашкадаваць, але пры гэтым непрыкметна так падштурхнуць наперад і ўзбадзёрыць.

***— Як хутчэй за ўсё памірыцца пасля сваркі?***

— У першую чаргу вы павінны адчуць у сабе любоў. А там ужо і словы знойдуцца. Натуральна, нельга рабіць выгляд, што сваркі не было, — гэта вялікая памылка. Але нельга патрабаваць быць пачутым.

У любой гісторыі заўсёды ёсць два бакі, і жаданне даказаць сваю праўду — няправільнае. Мудрыя вучылі: «У нас два вухі і адзін рот, таму больш слухай і ўдвая менш кажы». Які сэнс у тым, што я маю рацыю, калі мая жонка няшчасная?

***— Ці можна дараваць здраду?***

— Дараваць можна ўсё, калі людзі разумеюць адно аднаго. Але мала дараваць — важна, каб чалавек пакаяўся. У пытаннях пачуццяў трэба ісці ад сэрца, а не ад галавы. Галава будзе падказваць вам: «Зрабіў аднойчы, зробіць двойчы», а сэрца будзе казаць: «Калі ты зараз скажаш «не» гэтаму чалавеку, я разарвуся. Прымі яго! Мне будзе дрэнна нейкі час, але я гэта перанясу, справіцца і наступным разам буду больш падрыхтаваным».

***— Ці цяжка быць жанчынай — з пункту гледжання мужчыны?***

— Вельмі складана. Гэта значыць спраўляцца з непамернай колькасцю роляў, адведзеных жанчыне. Гэта ўменне быць далікатнай і моцнай, думаць творча і ў той жа час прагматычна, быць маці і каханай адначасова.

***— Каханне — гэта...***

— Гэта тое, што будзе ў фінале. Прайсці разам усё жыццё, перажыць усе нягоды і складанасці. У нас з жонкай былі татальныя крахі ў бізнесе, нейкія асабістыя бязладзіцы. Здараліся дні, калі было вельмі цяжка... Але важна ў такія моманты дапамагаць і падтрымліваць адно аднаго. Калі ты бачыш, што твая жанчыне балюча, будзь побач, выслухай і радуйся, што яна адкрываецца табе. Бо не ўсім можна паказаць свой боль. Мужчына павінен быць удзячны за гэты давер.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва.**

---

ул. Суражская, 10, офис 4,
Минск, 220007,
Беларусь

**Тел.:** +375 (17) 394 95 03
**Факс:** +375 (17) 394 77 40

info@bakertilly.by
**www.bakertilly.by**

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ Открытого акционерного общества "Белтрубопроводстрой" за период с 01.01.2018 года по 31.12.2018 года

№ 93

Руководителю Открытого акционерного общества "Белтрубопроводстрой"

### АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ С ОГОВОРКОЙ

Аудируемое лицо: Открытое акционерное общество "Белтрубопроводстрой" (сокращенное наименование -- ОАО "Белтрубопроводстрой") (далее по тексту — Аудируемое лицо).

Юридический адрес: 220123, Республика Беларусь, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129.

Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 12.02.2004 года за № 250, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100364117.

Мы провели аудит годовой бухгалтерской отчетности Открытого акционерного общества "Белтрубопроводстрой", состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2018 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, за исключением возможного влияния вопроса, описанного в разделе "Основание для выражения аудиторского мнения с оговоркой", прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Открытого акционерного общества "Белтрубопроводстрой" по состоянию на 31 декабря 2018 года, финансовые результаты ее деятельности и изменение ее финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

### ОСНОВАНИЕ ДЛЯ ВЫРАЖЕНИЯ АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ С ОГОВОРКОЙ

Аудируемым лицом не обеспечено ведение бухгалтерского учета филиала в Санкт-Петербурге в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь. Так, согласно абзацу девятому статьи 1 и пункту первому статьи 2 Закона Республики Беларусь от 12.07.2013 № 57-З "О бухгалтерском учете и отчетности" (далее -- Закон) действие Закона распространяется на организации, к которым, в частности, относятся выделенные на отдельный баланс филиалы юридических лиц Республики Беларусь, в том числе осуществляющие деятельность за ее пределами. Указанные филиалы, в целях Закона являющиеся организациями, обязаны вести бухгалтерский учет в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Наряду с этим на филиал распространяется действие Федерального закона Российской Федерации от 06.12.2011 № 402-ФЗ "О бухгалтерском учете" (подпункт 5 пункта 1 статьи 2 Закона № 402-ФЗ). Таким образом, аудируемому лицу необходимо обеспечить одновременное ведение бухгалтерского учета хозяйственной деятельности филиала в белорусских рублях согласно законодательству Республики Беларусь и в российских рублях в соответствии с законодательством Российской Федерации. Влияние данного отступления от требований Закона на статьи отчета о прибылях и убытках "Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг", "Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг", а также на раздел "Краткосрочные обязательства" бухгалтерского баланса за 2018 и 2017 годы не определено.

| 19 | Средства клиентов | 1203 | 4 932 | 9 512 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 162 | 361 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 12 092 | 23 137 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 61 651 | 61 651 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 17 | 17 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 19 953 | 18 753 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 846 | 1 326 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 92 641 | 84 961 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 175 108 | 166 708 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 187 200 | 189 845 |

### Отчет о прибылях и убытках на 1 июля 2019 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2019 | 01.07.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 4 226 | 4 581 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 | 13 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 218 | 4 568 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 47 | 46 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 65 | 72 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | (18) | (26) |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 979 | (2 077) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (832) | (1 200) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (4 399) | (3 683) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7 617 | 6 027 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 786 | 9 637 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 | 89 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 9 576 | 1 249 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 830 | 393 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 8 746 | 856 |

Председатель Правления С. Ф. Хайновский
Главный бухгалтер Н. А. Тиванова
Дата подписания: 2 июля 2019 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Клецкий райагросервис» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **погрузочно-разгрузочной площадки общей площадью 2462,0 кв. м с инв. № 641/С-14019, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 622550100001000224 площадью 0,4421 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Клецк, ул. Привокзальная, 4 (далее — объект).**

На объект отделом принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Минского областного исполнительного комитета наложен запрет на совершение регистрационных действий, который будет снят после перечисления денежных средств на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь

Начальная цена с НДС (20 %) **–79 920,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 7 992,00** бел. руб.).

**Условия продажи:**

- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;
- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);
- обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта — с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;
- использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **12.08.2019** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.08.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Мама, пачытай!

# СЯСТРА

У сям'і велічэзная падзея-радасць! Вячэрнім цягніком прыязджае Анюта. У яе першы водпуск. Дарынка лётае па хаце, як заведзеная: прыбірае яе. Хоць бы хутчэй той вечар!

А што ж сястра прывязе ёй — Дарынцы? У іх жа так заведзена, што калі з Гомеля або Хвойнічка (дзе ён бывае па рабоце) прыязджае бацька, або разам з маці яны вяртаюцца ад радні з гасцей, дык заўжды прывозяць гасцінцы. Гасцінцы бацькоў ужо добра вядомыя Дарынцы, а вось сястрыны — яшчэ не. Яна ж першы раз прыедзе з таго самага «выраю», пра які так бедкалася маці суседкам і ў які сястра з'ехала год назад. У нейкі горад, дзе адны шахты, у якіх здабываюць вугаль, і дзе не расце нават бульба. Бульба, магчыма, і не расце на тым вуголлі, а вось лётчыкі павінны там быць ужо дакладна. Дарынка памятае, як маці раіла-наказвала сястры выйсці замуж толькі за лётчыка, «бо ён высака лятае, увесь свет бачыць і зарабляе добрыя грошы».

«Мама, дзе я вам знайду таго лётчыка? Я яго ў вочы яшчэ не бачыла», — адбівалася сястра, калі была яшчэ дома. А цяпер вось, калі яна заехала так далёка, мусіць жа, яна ўжо бачыла жывых лётчыкаў, а можа, нават і пазнаёмілася. А можа яна з ім прыедзе? Вось будзе дзіва на ўвесь пасёлак. Тады ўсе пабачаць, якая ў Дарынкі сястра, — так сабе думае-марыць ўвесь дзень Дарынка ў чаканні сястры Анюты.

Да цягніка ідзе ўся сям'я. Нарэшце, у праёме вагона паказваецца Анюта. Сцяпан з Мацвеем падбягаюць першыя да металічных сходаў і падхопліваюць з яе рук вялікі чамадан і нейкі клунак. Дарынка туліцца да маці і саромеецца падысці да сястры. Яна нейкая не такая, як была год назад. Нейкая новая — гарадская. А тую абдымаюць-ціскаюць бацькі, маці плача ад шчасця, побач скача ад радасці Шурка, а старэйшыя браты толькі стаяць воддаль і пасміхаюцца. Анюта сама, нарэшце, нагінаецца і абдымае Дарынку, тут жа хоча яе падняць на рукі, але са смехам апускае і здзіўлена смяецца:

— Ого, як падрасла, ого, якая налітая каўганка! Мех бульбы няйначай па вазе! — кажа яна. Потым бярэ яе за руку з другога боку ад маці, і яны ўсе рушаць да хаты.

А дома ўсіх чакаюць гасцінцы. Нарэшце, Анюта адкрывае чамадан і пачынае даставаць іх. Спачатку яна выграбае з усіх чамаданавых закапелкаў і ссыпае на стол маленькія пахучыя абаранкі і цукеркі ў стракатых, незвычайных і не бачаных сям'ёй дагэтуль бліскучых абгортках. Запрашае ўсіх пакаштаваць. Як каго, а меншых яе братоў і Дарынку доўга прасіць няма ніякае патрэбы — па абаранку тут жа знікае ў іх ратах. Хлопцы, праглынуўшы маленькія круглячкі, штосьці пераглядваюцца, а Шурка тут жа не вытрымлівае і пытаецца сястру:

— А чаго ета абаранкі лакам так пахнуць? Яны што — палакованыя?

Бацькі тут жа на яго цыкаюць: дай дзеўцы апамятацца з дарогі, што прыдумаў — дзе той лак, а дзе абаранкі. Але сястра смяецца і дастае з чамадана загорнутую ў некалькі старых газет бутэльку. Аказваецца, там у ёй сапраўды лак. Прывезла хлопцам пакрываць імі іхныя лобзікавыя вырабы — шкатулкі, вазы, палічкі. Сцяпан з Мацвеем больш за ўсіх рады такому падарунку. Яны тут жа раскручваюць пакунак, і па ўсёй хаце пачынае плыць лакавы пах. Дык вось, аказваецца, чаму абаранкі аддаюць лакам! А Анюта тым часам ужо дастала і падае бацьку магазінную сарочку, а маці — адрэз квацістай, «не простай», тканіны на сукенку, а зверху на яго кладзе бардовую хусцінку ды яшчэ і некалькі газавых касынак. Потым настае чарга братоў. Тыя робяць выгляд, што ім нецікава, а самі з задавальненнем прымаюць: Шурка — чаравікі, а старэйшыя браты — цёплыя пальчаткі ды шалікі. Дарынка не зводзіць вачэй з чамадана: ну што ж, што ёй там захавана? Калі сястра, нарэшце, паварочваецца і падае ёй «гасцінец», Дарынка немее: карычневыя чаравічкі са шнурочкамі, а на канцы іх матляюцца яшчэ і скураныя кветачкі. А як яны пахнуць! Яна тут жа абувае абнову і глядзіць на свае ногі збоку і так, і сяк: каб жа не ноч на двары, яна б тут жа паймчала на вуліцу паказацца ўсім, а ў першую чаргу сяброўкам. Без сумневу, яны памлеюць ад зайдрасці. А тут яшчэ Анюта падае ёй і белыя шкарпэткі, і рознакаляровыя атласныя стужкі-каснікі. Так што пакуль млее яна сама, а не сяброўкі, і ў яе ад такой красы захоплівае дух.

— Донька мая, — кажа шчаслівая маці, — а ты ж, мусіць, увесь год збірала па капейчыне на ўсё гэтае багацце? Навошта ты так траціліся, мо не даядала, не дапівала?

— Ну, што вы такое кажаце, мама, а як бы я з пустымі рукамі прыехала? — адказвае шчаслівая Анюта. Яна рада не менш за сваіх родных — усім дагадзіла, усе задаволены.

Дарынка ў поўным захапленні ад сваіх падарункаў, прыціснуўшы іх да сябе, перад тым як заснуць пад бокам у сястры, паспявае яшчэ падумаць: якая ж яна шчаслівая, што мае такую сястру! Як добра, што Анюта выпырхнула і паляцела «ў выраі» так далёка і цяпер змажа раз у год прыязджаць дамоў у водпуск і прывозіць цэлыя чамаданы падарункаў! Праўда, яна яшчэ не сустрэла свайго лётчыка. Дык не бяда — ён жа не грыб, каб папаўся адразу пад ногі. За год хіба яго знойдзеш?

...Нядоўга Дарынка пафарсіла ў сваіх чаравічках: ногі яе так хутка раслі, што тыя перасталі ёй налазіць. Амаль новыя, іх прыйшлося дакладаць да іншых падарункаў-гасцінцаў — для радні ў Калінкавічы. Чаравічкі прыйшліся якраз меншай стрыечнай сястрычцы.

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

## Нататкі шматдзетнага таткі



Пакінулі сына аднаго з малодшай дачкой. Праз нейкі час вяртаемся, сын гаворыць:

— Уяўляеш, паставіў Ксеніі на кампе нарэзку песенек з сучасных мультфільмаў — прыбегла да мяне ўся ў слязах: махае рукамі і крычыць незадаволена. Тады я паставіў ёй «Па дарозе з воблакамі» з савецкага мульціка, дык яна мяне потым разоў дзесяць прымушала гэту песеньку наноў ставіць, а сама пад яе танцавала.

Як па мне, дык нічога дзіўнага. Маленькія дзеці падсвядома цягнуцца да добрага і цудоўнага, а агрэсіўны сучасны шлак машынальна выклікае ў іх непрыманне. Мы з малодшымі дзецьмі ўжо разоў сто перагледзелі Карлсана, Чабурашку і Ката Леапольда, і ні разу яны мне не сказалі, што гэта бязглуздыя мульцікі.

А вось старэйшыя дзеці гадоў пяць таму сказалі мне прамым тэкстам: «Тата, толькі не стаў нам больш сумныя савецкія мульцікі». І малодшыя таксама, канешне, аднойчы так скажуць — і я іх паслухаю.

Але, запэўніваю вас, калі яны вырастуць і паразумнеюць, і навучацца адрозніваць добрае ад дрэннага, яны самі з задавальненнем будуць глядзець гэтыя самыя «сумныя» мультфільмы, і будуць ставіць іх сваім дзецям.

* * *

Двайняткі:
— Тата, давай згуляем у настольную гульню.
— У якую?
— Выбірай: у «Мема» або ў «Добл».
— А якая прасцейшая?
— «Мема» на кемлівасць, а «Добл» — на рэакцыю.
Жонка з кухні:
— Выбірай «Добл», там думаць увогуле не трэба.
Я:
— Добра, давайце праверым, у каго лепшая рэакцыя. (Зразумела, што ў кемлівасці я з імі не магу цягацца.)

Згулялі. Па праўдзе кажучы, лепш бы я выбраў «Мема» — тады б у мяне яшчэ заставаліся ілюзіі адносна ўласнай рэакцыі. А так мала таго, што я не вельмі кемлівы, дык яшчэ, як высветлілася, і тормаз.

**Павел ХОЛАД.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### ПАКАШТУЙЦЕ!

## Скавароднікі з тварагом і зяленівам



**Спатрэбіцца.** *Для цеста: мука — 450 г, вада — 200 мл, алей — 1 ст. л., соль — 1 ч. л. без горкі. Для начынкі: тварог — 300 г, зялёная цыбуля, кроп, кінза, перац чорны молаты і соль — на смак. Масла — для змазкі.*





Прапорцыі ў начынцы можна вар'іраваць па перавагах: менш тварагу і больш зяленіва, больш тварагу і трохі зяленіва. Цеста абавязкова трэба раскатваць вельмі тонка і змазваць такія скавароднікі маслам адразу ж, зняўшы з патэльні, тады іх смак не расчаруе.

Можна таксама дадаваць у начынку свае любімыя спецыі.





У місцы змяшаць ваду, соль, алей і дадаць шклянку мукі. Затым усыпаць яшчэ шклянку мукі і паспрабаваць замясіць цеста. Яно атрымаецца вельмі мяккае і ліпкае, яшчэ не канчаткова патрэбнай кансістэнцыі. Падсыпаючы малымі порцыямі астатнюю муку, замясіць вельмі мяккае цеста. Пакінуць яго пад ручніком, а тым часам падрыхтаваць начынку.

Тварог злучыць з сечаным зяленівам і соллю. Пасыпаць любімымі спецыямі і чорным перцам.

Цеста падзяліць на шэсць роўных частак. Узяць у работу адну частку цеста, астатнія шчыльна загарнуць у ручнік. Раскатаць цеста ў тонкую аладку, падсыпаючы муку па неабходнасці. У цэнтр выкласці тваражную начынку. Зашчыпаць скавароднік, збіраючы яго краі да сярэдзіны і выганяючы паветра знутры. Затым асцярожна раскатаць да тонкага стану, імкнучыся не парваць. Калі такое адбылося, то прысыпаць разрыў мукой.

Скавароднік атрымліваецца празрысты, з тонкім цестам. Гэта важна, каб пры абсмажванні цеста абавязкова паспела прыгатавацца.

Выраб трэба абсмажыць з двух бакоў на сухой патэльні. Пры абсмажванні можна накрываць патэльню накрыўкай. Гатовыя скавароднікі адразу ж змазваць маслам.

### ХУТКАЯ ДАПАМОГА

## Каб выдаліць плямы ад фарбы з адзення

У гэтым дапаможа ацэтон — апрацуйце ім выпацканае месца. Пасля гэтага для поўнага выдалення фарбы выкарыстоўвайце нашатырны спірт.

## Каб хутка супакоіцца

Калі трэба хутка супакоіцца, націсніце на кропку паміж носам і вуснамі і патрымайце там вялікі палец тры секунды. Гэты спосаб можа дапамагчы, нават калі ў вас з'явілася нервовая дрыготка.

### РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

## Можна не толькі піць...

- Каб без болю зняць з раны лейкапластыр, прамачыце яго гарэлкай. Яна растворыць клей.
- Каб прачысціць замазку швоў у ванных і душах, напоўніце бутэльку з распырсквальнікам гарэлкай, распырскайце на швы, пачакайце пяць хвілін і змыйце вадой. Алкаголь у гарэлцы забівае грыбкі, цвіль і іншыя мікраарганізмы.
- Каб прачысціць лінзы акуляраў, пратрыце іх анучкай, злёгку ўвільготненай гарэлкай. Алкаголь у гарэлцы пачысціць шкло і заб'е бактэрыі.
- Дадайце чарачку гарэлкі ў бутэльку шампуню. Алкаголь прачышчае скуру галавы, выдаляе таксіны і стымулюе рост валасоў.
- Каб пазбавіцца ад вушнога болю, капніце некалькі кропель гарэлкі ў вуха. Пачакайце некалькі хвілін, затым прамакніце. Гарэлка заб'е бактэрыі, якія выклікаюць запаленне і боль у вуху.

*ЯК ЗЯЦЬ У ХАТУ — ЦЕШЧА ЗА ЯЕЧНЮ (Беларуская прымаўка)*

# КАБ НЕ БАЛЕЛА ГАЛАВА ПАСЛЯ РАМОНТУ

### У якіх выпадках звычайна правяраюць паветра ў кватэры

— Мы праводзім замеры і лабараторныя даследаванні атмасфернага паветра ў кватэрах па зваротах грамадзян на бясплатнай і платнай аснове, — расказвае спецыяліст. — Калі паступае зварот, мы выязджаем і праводзім даследаванне ў жылых пакоях. Гэта значыць, што ў калідоры, кухні, санвузле мы замераў не праводзім. І калі чалавек скардзіцца на паветра ў кухні, мы рэкамендуем правесці даследаванне канкрэтнага вырабу (напрыклад, дзверцаў або палічак).

Часцей за ўсё да нас звяртаюцца пасля набыцця новай мэблі: калі людзі пачынаюць адчуваць яе пах, у іх з'яўляецца галаўны боль і г. д. Хоць шкодныя рэчывы ў кватэры могуць выдзяляць амаль усе яе элементы, пачынаючы ад сцяжкі падлогі і заканчваючы шпалерамі. І калі чалавеку патрэбныя даныя нашых замераў для судовага разбору, то мы заўсёды папярэджваем, што добры юрыст іх змажа аспрэчыць. Таму, каб даказаць, што «вінаватай» з'яўляецца, напрыклад, шафа з ДСП, трэба яшчэ дадаткова здаваць на экспертызу частку шафы.

Напрыклад, нядаўна адзін мінчанін звярнуўся да нас з просьбай праверыць паветра ў пакоі ў сувязі з набыццём новай канапы. Мы выехалі, правялі лабараторныя даследаванні ў гэтым пакоі і выявілі павышаную колькасць фармальдэгіду. Потым канапа была вынесена з пакоя, але перавышэнне фармальдэгіду ў паветры засталося. Праўда, дадатковыя даследаванні паказалі, што прычынай усё ж была менавіта яна.

Часам да нас звяртаюцца з просьбай зрабіць пробы паветра ў кватэры, таму што ў дзіцяці ёсць алергія. Але я раю лепш тую суму, якую людзі гатовыя заплаціць нам, аддаць на непасрэдна алергічныя пробы ў медустанове, каб выявіць канкрэтныя алергены, на якія рэагуе арганізм дзіцяці.

Яшчэ ў нас быў выпадак, калі на першым паверсе жылога дома знаходзіўся магазін бытавой хіміі, а на другім паверсе, у кватэры проста над гэтай крамай, пражывала жанчына-астматык. Мы рабілі замеры, ніякіх перавышэнняў ГДК (гранічна дапушчальнай колькасці) таксічных рэчываў у паветры не было, але пах бытавой хіміі ад крамы ў кватэры адчуваўся. І толькі калі разабралі столь у гэтай краме, выявілі, што не ўсе швы і стыкі там добра замазаныя. Як толькі гэта выправілі, пах у кватэры знік і гэтая жанчына змагла нармальна жыць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



### Што трэба ведаць пра мэблю

— Часцей за ўсё ўскладняе жыццё і негатыўна ўплывае на здароўе новая мэбля з ДСП, у якой выкарыстоўваецца няякасная клеевая аснова, дзе дрэнна заладжаны тарцы і г. д. Таму, калі пах ад новай мэблі доўга не выветрываецца і вы адчуваеце яго на працягу некалькіх месяцаў, трэба задумацца і прыняць нейкія меры.

У ДСП утрымліваюцца карбамідафармальдэгідныя або фенолфармальдэгідныя смолы, якія выкарыстоўваюцца як клей. У побыце з іх могуць выдзяляцца шкодныя для здароўя фармальдэгід і фенол.

Таму мы раім, калі ў кагосьці ёсць, напрыклад, стол або спальня з натуральнага дрэва, задумацца, ці варта гэта мяняць на нешта зробленае з драўнянай габлюшкі, хай нават новая мэбля і выглядае больш сучасна і прыгожа. І новыя шклопакеты з пластыку, якія цяпер усе ўсталёўваюць, на самай справе значна горш уплываюць на здароўе, чым старыя драўляныя вокны. Заўсёды варта падумаць, што на што мы мяняем. Асабліва адказна трэба падыходзіць да выбару мэблі ў дзіцячы пакой.

Любімае правіла пакупніка: «Каб было прыгожа і нядорага» пасля можа саслужыць нядобрую службу. Таму пры набыцці мэблі пераканайцеся, што яна адпавядае дзейснаму на тэрыторыі Мытнага саюза Тэхнічнаму рэгламенту ТР МС 025/2012 «Аб бяспецы мэблевай прадукцыі». Пры гэтым для дзіцячай мэблі павінен быць аформлены Сертыфікат адпаведнасці ТР МС. А для мэблі для жылых і грамадскіх будынкаў павінна быць аформлена дэкларацыя адпаведнасці гэтаму ТР МС.

Нялішне звярнуць увагу на якасць аздаблення, а менавіта праверыць, ці добра зафарбаваныя або аблееныя ламінатам кантавыя паверхні панэляў. Небяспечнымі могуць быць таксама дрэнна апрацаваныя край і сколы ДСП (для бяспекі неабходна абавязкова ізаляваць адкрытыя ўчасткі).

Пры набыцці вырабаў з ДСП можаце звярнуць увагу на тое, да якога «класа эмісіі» вольнага фармальдэгіду яны належаць: найбольш бяспечным лічыцца матэрыял, які належыць да класа Е-1 (менш за 10 мг фармальдэгіду на 100 г абсалютна сухой драўнянай пліты).

### Не будзьце фанатамі рамонту

— Пасля свежага рамонту крыніцай небяспекі могуць быць і лінолеум або ламінат, і новыя вінілавыя шпалеры, і вокны ПВХ, і нацяжная столь, і новая шафа-купэ... Часам таксічныя злучэнні знаходзяць у даволі нечаканых месцах. Так, быў выпадак, калі ў кватэры праверылі ўжо ўсё, што толькі можна праверыць, а крыніца забруджвання паветра ў рэшце рэшт была выяўлена ў сцяжцы падлогі, дзе выкарыстоўвалася няякасная клеевая аснова, з дапамогай якой пасля прыклейваўся паркет.

Рамонт у кватэры праводзіць, вядома, трэба, але не варта рабіць яго занадта часта. І, купляючы лакі або фарбы для рамонту, заўсёды звяртайце ўвагу на надпісы «толькі для вонкавых работ» або «для ўнутраных работ». У памяшканні можна выкарыстоўваць толькі матэрыялы для ўнутраных аздобных работ. Трэба сказаць, што з адваротным мы яшчэ ні разу не сутыкаліся ў кватэрах, а вось у інтэрнатах пару разоў здаралася.

Усе будаўнічыя і аздобныя матэрыялы павінны адпавядаць дзеючаму на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь тэхнічнаму рэгламенту «Будынкі і збудаванні, будаўнічыя матэрыялы і вырабы. Бяспека» (ТР 2009/013/BY). У прыватнасці, павінна быць аформлена дэкларацыя адпаведнасці на тыя матэрыялы, якія пазначаны ў дадатку да гэтага ТР.

### Небяспека, якую нельга «паспрабаваць на зуб»

— У нашых кватэрах праблемай у апошні час стала і павышанае электрамагнітнае поле. Яно ствараецца электракабелямі, камп'ютарамі і аргтэхнікай, бытавымі прыборамі і сотавымі тэлефонамі. Калі знаходзіцца ў павышаным электрамагнітным полі штодзень, то яно можа выклікаць паражэнне сэрца, сасудаў, залоз унутранай сакрэцыі і нервовай сістэмы, стаць прычынай сур'ёзных захворванняў. На жаль, яго нельга ўбачыць, адчуць, вымераць самастойна, «паспрабаваць на зуб». Але яго можна пастарацца пазбегнуць.

Часам да нас звяртаюцца гараджане са скаргамі на базавыя станцыі сотавай сувязі, якія, на іх думку, знаходзяцца вельмі блізка да іх дома і могуць аказваць негатыўны ўплыў на людзей. Але я раіла б звярнуць больш увагі на выкарыстанне сотавага тэлефона. Гэта значна мацней уплывае на нас. Мы ўжо неадназова паказвалі тым, хто да нас звяртаўся з такімі скаргамі, колькі выпраменьвае вышка, якая стаіць на іх двары, і колькі выпраменьвае іх уласны мабільнік: яго электрамагнітнае выпраменьванне ў разы вышэйшае. Асабліва гэта датычыцца старых кнопачных тэлефонаў. А што да вышак, то чым іх больш, тым гэта больш бяспечна для ўсіх нас. Таму што калі вышка сотавай сувязі размешчана далёка, тэлефону, каб злавіць яе сігнал, даводзіцца ў шмат разоў узмацняць сваё выпраменьванне.

Тое ж самае ў метро. Лепш у ім не карыстацца мабільнікам, таму што, калі цягнік ад'язджае ад станцыі, сувязь робіцца горшая, тэлефон спрабуе злавіць сігнал і ідзе ўсплёск электрамагнітнага выпраменьвання. Яшчэ адна парада: не прыкладвайце смартфон да вуха ў той момант, калі ён знаходзіцца ў працэсе пошуку апаратара сеткі — да таго часу, пакуль не стануць чутныя гудкі. У гэты момант ён выпраменьвае больш за ўсё.

Калі мы кладзёмся спаць, нельга класці тэлефон каля галавы. Наогул, чым далей ён ад нас будзе ляжаць, тым лепш. А яшчэ лепш адключаць яго на ноч зусім.

А вышкі сотавай сувязі праходзяць праз Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, атрымліваюць санітарна-гігіенічнае заключэнне. Перад тым як іх размясціць, на камп'ютары разлічваюцца нормы бяспекі, і прамяні ад іх ніколі не накіроўваюцца на дамы: альбо ўверх, альбо паміж дамоў. Па зваротах грамадзян мы можам выехаць на месца і зрабіць лабараторныя даследаванні ў кватэры, каб пераканаць іх у бяспецы вышкі.

Крыніцай электрамагнітнага выпраменьвання з'яўляюцца і мікрахвалёўкі. І калі мы ставім разаграваць прадукты ў мікрахвалёўку, лепш пры гэтым адысці ад яе на адлегласць выцягнутай рукі, каб засцерагчы сябе.

### Мяняйце ртутныя градуснікі на электронныя

— Яшчэ ў нас шмат зваротаў з-за пабітых градуснікаў, асабліва ў сезон прастуд: мы прыязджаем і даследуем паветра на пары ртуці. Даволі часта мы сапраўды пры гэтым бачым перавышэнне паказчыкаў — так адбываецца, калі дрэнна прыбралі ртуць, нейкі шарык не заўважылі. Адпаведна, мы даём рэкамендацыі, што рабіць у гэтым выпадку, як прыбіраць у кватэры, каб засцерагчы сябе. А вашым чытачам магу параіць наступнае: ні ў якім разе не спрабуйце прыбіраць ртуць з дапамогай пыласоса і ніколі не мыйце анучу, якой прыбіралі ртуць, у пральнай машыне, таму што ў гэтым выпадку і пыласос, і пральная машына самі стануць крыніцамі ртутнага забруджвання. Мы з гэтым ужо сутыкаліся пры выкліках, і ў гэтых выпадках адзіным правільным рашэннем было выкінуць такі пыласос або пральную машыну.

**Святлана БУСЬКО.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению УП «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже **зерносклада лит 1/к (в состав входят: сарай лит 1, пристройка Б1/к) общей площадью 1335,6 кв. м с инв. № 610/ С 59705,** расположенный на земельном участке с кадастровым номером 620885206101000150 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,9933 га**, по адресу: **Минская область, Борисовский район, Моисеевщинский с/с, аг. Моисеевщина.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **160 283,18** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **16028,32** бел. руб.).

**Условия продажи:**

поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликованы в газете «Звязда» от 03.06.2019.

Аукцион состоится **25.07.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.07.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**


А не шкодзь!

# ЗОРКІЯ ВОКА І АБ'ЕКТЫЎ

## Як выкрываюць паляўнічых-нелегалаў

**Некалькі фактаў незаконнага палявання выяўлены за апошні час, іх акалічнасці даволі незвычайныя, паведамілі ў дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Ранкам жыхар Ваўкавыска з балкона сваёй кватэры заўважыў, як да смеццевых кантэйнераў у двары пад'ехаў мікрааўтобус, з якога ў сметніцу выкінулі два вялікія мяхі са слядамі крыві. Як аказалася, у іх былі спакаваныя рэшткі разабранай тушы аленя (канечнасці, галава, шкура з кулявой адтулінай). Мужчына быў паляўнічым, ведаў, што здабываць аленяў цяпер забаронена, і паведаміў пра знаходку ў інспекцыю.

Па апісанні аўто і запісах з вулічных камер відэаназірання дзяржінспектары і супрацоўнікі РАУС устанавілі ўладальніка мікрааўтобуса. Калі з ім звязаліся па тэлефоне, падазраваны паспрабаваў падмануць праваахоўнікаў, заявіўшы, што цяпер знаходзіцца ў іншым горадзе. Тым не менш неўзабаве мужчына выйшаў са свайго дома, і яго затрымалі.

Унутры аўтамабіля эксперты выявілі валасінкі шэрсці жывёлы, якія адправілі на даследаванне. Нанесеная прыродзе шкода ацэньваецца ў 7,6 тысячы рублёў, распачата крымінальная справа.

Невядомы мужчына, які прагульваўся па лесе са зброяй, двойчы за дзень трапіў у аб'ектыў фотапасткі, устаноўленай на тэрыторыі лясніцтва ў Бярэзінскім раёне. Кім з'яўляецца чалавек на фота, высветлілі падчас аператыўнай работы інспектары аднайменнай міжрайінспекцыі. Яны даведаліся, што паляўнічы-нелегал жыве ў вёсцы Васілеўшчына, і разам з супрацоўнікамі РАУС наведаліся да яго для праверкі.

Пасля размовы вясковец прызнаў факт палявання і выдаў нелегальную зброю — гладкаствольную стрэльбу і вінтоўку Мосіна, з якой мужчына зафіксаваны на фота, а таксама два зменныя ствалы да вінтоўкі. Пакольк здабыць дзічыну парушальнік не паспеў, яго прыцягнуць толькі да адміністрацыйнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка:

# ЗАО «ТК Банк»

**www.tcbank.by**

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ**
**на 31 декабря 2018 года**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | 31 декабря 2018 года | 31 декабря 2017 года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 9 | 11 518 | 61 488 |
| Средства в финансовых организациях | 10 | 49 215 | 36 754 |
| Кредиты клиентам | 11 | 4 110 | 3 380 |
| Ценные бумаги | 12 | 48 496 | 80 026 |
| Производные финансовые активы | 13 | 14 489 | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для продажи | | 344 | - |
| Инвестиционная собственность | 15 | 30 662 | 29 452 |
| Основные средства и нематериальные активы | 14 | 16 013 | 17 491 |
| Предоплата по налогу на прибыль | | 57 | - |
| Актив по отложенному налогу на прибыль | 16 | 1 787 | 4 113 |
| Прочие активы | 17 | 8 245 | 22 740 |
| **ИТОГО АКТИВЫ** | | **184 936** | **255 444** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Средства финансовых организаций | 18 | 13 263 | 91 739 |
| Средства клиентов | 19 | 8 139 | 3 419 |
| Обязательство по текущему налогу на прибыль | | - | 1 640 |
| Прочие обязательства | 17 | 451 | 2 545 |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | **21 853** | **99 343** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 20 | 188 975 | 188 975 |
| Эмиссионный доход | | 61 | 61 |
| Фонд переоценки ценных бумаг | | (10 276) | (6 383) |
| Накопленный убыток | | (15 677) | (26 552) |
| **ИТОГО СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | **163 083** | **156 101** |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | **184 936** | **255 444** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ**
**за год, закончившийся 31 декабря 2018 года**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | Прим. | **Год, закончившийся 31 декабря 2018 года** | **Год, закончившийся 31 декабря 2017 года** |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | | 12 606 | 21 150 |
| Процентные расходы | | (29) | (7 022) |
| **Чистые процентные доходы** | 22 | **12 577** | **14 128** |
| Комиссионные доходы | | 119 | 493 |
| Комиссионные расходы | | (136) | (114) |
| **Чистые комиссионные доходы** | 23 | **(17)** | **379** |
| Чистый доход по операциям с финансовыми инструментами, учитываемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток | | 14 489 | - |
| Чистые доходы по операциям с иностранной валютой | 24 | 241 | 272 |
| Чистые доходы по операциям с финансовыми инструментами, оцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход / (2017: с финансовыми инструментами, имеющимися в наличии для продажи) | 25 | (1 251) | (631) |
| Чистые прочие доходы | 26 | 10 156 | 4 343 |
| **Итого операционные доходы** | | **36 195** | **18 491** |
| Чистое изменение резервов под ОКУ по финансовым активам / (2017: под обесценение финансовых активов) | | (6 371) | 8 967 |
| Чистое изменение резервов на риски и платежи | 21 | 1 341 | (2 308) |
| Чистое изменение резерва под обесценение прочих нефинансовых активов | | 394 | (1 498) |
| Операционные расходы | 27 | (13 146) | (9 116) |
| **Прибыль до налогообложения** | | **18 413** | **14 536** |
| Расходы по налогу на прибыль | 16 | (5 112) | (1 803) |
| **Прибыль за год** | | **13 301** | **12 733** |
| **ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ ДОХОД** | | | |
| Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в прибыли или убытки | | | |
| Чистое изменение справедливой стоимости финансовых активов, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход / (2017: имеющихся в наличии для продажи) | | (7 131) | (9 073) |
| Чистый результат, перенесенный в прибыль или убыток по финансовым активам, оцениваемым по справедливой стоимости через прочий совокупный доход / (2017: имеющимся в наличии для продажи) | | 1 375 | 585 |
| Отложенный налоговый актив | | 1 186 | 2 122 |
| Изменение резерва под ОКУ по ценным бумагам, оцениваемым по справедливой стоимости через прочий совокупный доход | | 438 | - |
| **Итого прочий совокупный убыток, который может быть реклассифицирован в прибыли или убытки** | | **(4 132)** | **(6 366)** |
| **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД** | | **9 169** | **6 367** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ**
**за год, закончившийся 31 декабря 2018 года**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | **Прим.** | **Год, закончившийся 31 декабря 2018 года** | **Год, закончившийся 31 декабря 2017 года** |
|---|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | | |
| Проценты полученные | | 8 702 | 20 178 |
| Проценты уплаченные | | (29) | (8 413) |
| Комиссии полученные | | 117 | 494 |
| Комиссии уплаченные | | (136) | (113) |
| Реализованный результат по операциям с иностранной валютой | | 745 | 297 |
| Реализованный результат по операциям с ценными бумагами | | (1 251) | (631) |
| Прочие полученные доходы | | 10 180 | 17 122 |
| Прочие уплаченные расходы | | (3 373) | (7 690) |
| Уплаченный налог на прибыль | | (557) | (3 966) |
| **Движение денежных средств, полученных от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах** | | **14 398** | **17 278** |
| *Увеличение / (уменьшение) операционных активов* | | | |
| Средства в финансовых организациях | | (17 014) | (37 427) |
| Кредиты клиентам | | (1 203) | 60 |
| Прочие активы | | 4 634 | 4 083 |
| *Чистое увеличение операционных обязательств* | | | |
| Средства финансовых организаций | | (81 480) | (231 266) |
| Средства клиентов | | 4 484 | (110) |
| Прочие обязательства | | (1 171) | (5 070) |
| **Чистое движение денежных средств от операционной деятельности** | | **(77 352)** | **3 022** |
| **Денежные потоки от инвестиционной деятельности** | | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | | (587) | (456) |
| Поступления от реализации основных средств и нематериальных активов | | 519 | 1 |
| Приобретение инвестиционной собственности | | (899) | - |
| Покупка ценных бумаг | | (196 174) | (454 285) |
| Продажа ценных бумаг | | 223 420 | 709 759 |
| **Чистое движение денежных средств от инвестиционной деятельности** | | **26 279** | **255 019** |
| **Денежные потоки от финансовой деятельности** | | | |
| Выплата дивидендов | | - | - |
| **Чистое движение денежных средств от финансовой деятельности** | | **-** | **-** |
| **Чистое увеличение / (уменьшение) денежных средств и их эквивалентов** | | **(51 073)** | **2 567** |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | | 1 146 | 2 568 |
| Эффект ожидаемых кредитных убытков на денежные средства и их эквиваленты | | 43 | - |
| **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного года** | **9** | **61 488** | **56 353** |
| **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного года** | **9** | **11 518** | **61 488** |

Прилагаемые примечания составляют неотъемлемую часть данной консолидированной финансовой отчетности.

Подписано и утверждено к выпуску от имени Правления Банка:

Хайновский С. Ф. — Председатель Правления
Тиванова Н. А. — Главный бухгалтер

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИЯХ В КАПИТАЛЕ**
**за год, закончившийся 31 декабря 2018 года**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| | **Уставный капитал** | **Эмиссионный доход** | **Фонд переоценки ценных бумаг** | **Накопленный убыток** | **Итого собственный капитал** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Остаток на 1 января 2017 года** | **188 975** | **61** | **(17)** | **(39 285)** | **149 734** |
| **Совокупный доход / (убыток) за год** | **-** | **-** | **(6 366)** | **12 733** | **6 367** |
| **Прибыль за год** | - | - | - | 12 733 | **12 733** |
| **Прочий совокупный убыток** | - | - | (6 366) | - | **(6 366)** |
| **Остаток на 31 декабря 2017 года** | **188 975** | **61** | **(6 383)** | **(26 552)** | **156 101** |
| **Влияние первого применения МСФО 9 на 1 января 2018 года** | - | - | 239 | (2 426) | **(2 187)** |
| **Пересчитанный остаток на 1 января 2018 года** | **188 975** | **61** | **(6 144)** | **(28 978)** | **153 914** |
| **Совокупный доход / (убыток) за год** | **-** | **-** | **(4 132)** | **13 301** | **9 169** |
| **Прибыль за год** | - | - | - | 13 301 | **13 301** |
| **Прочий совокупный убыток** | - | - | (4 132) | - | **(4 132)** |
| **Остаток на 31 декабря 2018 года** | **188 975** | **61** | **(10 276)** | **(15 677)** | **163 083** |

ФБК
ФБК БЕЛ

PKF
Accountants & business advisers

Исх. № 05-01/177 от 21 июня 2019 года.

**ЗАКЛЮЧЕНИЕ НЕЗАВИСИМОГО АУДИТОРА**

*Акционерам, Наблюдательному Совету и Правлению Закрытого акционерного общества «ТК Банк»*

**Мнение**

Мы провели аудит прилагаемой консолидированной финансовой отчетности Закрытого акционерного общества «Банк торговый капитал» (далее – ЗАО «ТК Банк», Группа), состоящей из консолидированного отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2018 года, консолидированного отчета о совокупном доходе, консолидированного отчета об изменениях в капитале и консолидированного отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к консолидированной финансовой отчетности, которые включают краткий обзор основных положений учетной политики.

По нашему мнению, консолидированная финансовая отчетность отражает справедливо во всех существенных аспектах консолидированное финансовое положение Группы на 31 декабря 2018 года, а также ее консолидированные финансовые результаты и консолидированное движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

**Основание для выражения мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, Международными стандартами аудита (далее – МСА). Наша ответственность в соответствии с этими правилами и стандартами описана далее в разделе «Ответственность аудитора за аудит консолидированной финансовой отчетности» данного аудиторского заключения.

Мы независимы по отношению к Группе в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров Совета по международным стандартам этики для бухгалтеров (далее – Кодекс СМСЭБ) и нами выполнены прочие этические обязанности в соответствии с Кодексом СМСЭБ.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения нашего мнения.

**Важные обстоятельства**

Мы обращаем внимание на ограничение лицензионных полномочий ЗАО «ТК Банк», а также на внешнее обстоятельство, которые влияют на деятельность ЗАО «ТК Банк», описанные в Примечании 2 к консолидированной финансовой отчетности. Мы не выражаем модифицированное аудиторское мнение в связи с этими вопросами.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для проводимого аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой финансовой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения об этих вопросах.

<u>Резерв под ожидаемые кредитные убытки по средствам в финансовых организациях и кредитам клиентам в соответствии с МСФО 9</u>

В связи со значимостью средств в финансовых организациях и кредитов клиентам и важностью профессиональных суждений и оценок, которые используются в отношении оценки ожидаемых кредитных убытков в соответствии с новым стандартом МСФО 9 «Финансовые инструменты», данный вопрос является ключевым вопросом аудита.

Выявление признаков обесценения, факторов значительного увеличения кредитного риска, определение значений вероятности дефолта и уровня потерь при дефолте, определение возмещаемой стоимости и прогнозирование макроэкономических показателей являются процессом, который включает значительное использование профессионального суждения.

Оценка резерва под ожидаемые кредитные убытки предполагает использование методик оценки, включая внутренние кредитные рейтинги для определения вероятности дефолта, исторические данные для определения уровня потерь при дефолте, а также прогнозирование макроэкономических показателей. Факторы значительного увеличения кредитного риска также носят субъективный характер и основаны на увеличении кредитного риска по внутренним рейтингам, длительности просроченной задолженности и иных показателях.

Использование различных моделей и допущений может существенно повлиять на уровень резерва под ожидаемые кредитные убытки по средствам в финансовых организациях и кредитам клиентам.

Примечание 4 «Принципы учетной политики», Примечание 5 «Существенные оценки и профессиональные суждения в применении учетной политики», Примечание 10 «Средства в финансовых организациях», Примечание 11 «Кредиты клиентам» и Примечание 28 «Система управления рисками», включенные в консолидированную финансовую отчетность, содержат информацию о резерве под ожидаемые кредитные убытки, а также подход руководства к оценке и управлению кредитным риском.

В ходе наших аудиторских процедур мы рассмотрели и оценили методики Группы по оценке резервов под ожидаемые кредитные убытки по средствам в финансовых организациях, кредитам, предоставленным юридическим и физическим лицам.

Мы рассмотрели факторы кредитного риска, используемые Группой для определения значительного увеличения кредитного риска.

Мы проанализировали рейтинговые модели, ключевые исходные данные и допущения, а также модели вероятности дефолта, уровня восстановления и коэффициента макропрогноза, используемые для расчета ожидаемых кредитных убытков.

